Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

САКАВІК 16 1933 г. № 59 (4603) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

АБ АДКАЗНАСЬЦІ СЛУЖАЧЫХ У ДЗЯРЖАЎНЫХ УСТАНОВАХ І ПРАДПРЫЕМСТВАХ ЗА ШКОДНІЦКІЯ АКТЫ

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР

За апошні час выяўлены факты ўдзелу ў контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай дзейнасьці некаторых дзяржаўных служачых, асабліва абавязаных па сваім становішчы і прадастаўленых ім правох праяўляць да рабоча-сялянскай дзяржавы чэсныя і добрасумленныя адносіны.

У сувязі з гэтым Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюзу ССР растлумачвае, што прадастаўленае АДПУ, на падставе пастановы ЦВК Саюзу ССР ад 15 лістапада 1923 г., права разгляду на судовых пасяджэньнях калегіі АДПУ спраў па дыверсіях, падпалах, узрывах, псаваньні машынных установак дзяржаўных прадпрыемстваў і інш. відах шкодніцтва з дастасаваньнем у залежнасьці ад характару злачынства ўсіх мер рэпрэсіі — павінна праводзіцца з асаблівай строгасьцю ў адносінах да выяўленых у гэтых злачынствах служачых дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР А. ЕНУКІДЗЭ.

Масква, Крэмль, 14 сакавіка 1933 г.

Ніякай літасьці ворагам народу!

Рэшткі разьбітых і разьвеяных Кастрычніцкай рэвалюцыяй клясаў, пасьледкі і выродкі раней прывілеяваных станаў са зьвярынай нянавісьцю сваёй да рабочых і працоўных сялянскіх мас, да будаўніцтва сацыялізму, не затрымліваюцца ні перад якімі, нават самымі агіднымі сродкамі барацьбы, каб павярнуць развіцьцё нашай краіны, каб зноў сесьці на шыю рабочаму і працоўнаму селяніну.

Яны ня спыняюцца перад тым, каб разбураць фабрыкі, заводы, электрастанцыі, руднікі і капальні, якія належаць рабоча-сялянскай дзяржаве. Яны ня спыняюцца перад руйнаваньнем гаспадарак працоўных сялян. Яны хацелі-б, калі-б маглі, замарыць голадам мільёны рабочых і сялян, жонак і дзяцей рабочых і калгасьнікаў.

12-га сакавіка было апублікавана паведамленьне калегіі АДПУ аб прыгаворы над удзельнікамі контр-рэвалюцыйнай арганізацыі, якая займалася шкодніцкай работай у некаторых органах Наркамзему і Наркамсаўгасаў, галоўным чынам у сельска-гаспадарчых раёнах Украіны, Паўночнага Каўказу і Беларусі.

Учора-ж мы апублікавалі паведамленьне АДПУ аб выкрыцьці і арышце групы злачынных элемэнтаў з ліку дзяржаўных служачых у сыстэме Наркамцяжпраму. Гэта група ставіла сабе задату разбурэньне электрастанцый з дывэрсыйнай мэтай, прычым у гэтай арганізацыі прымалі актыўны ўдзел некаторыя служачыя ангельскай фірмы «Мэтрапалітэ-Віккерт», якія працавалі ў нашай электрапрамысловасьці па дагаворы з гэтай фірмай у якасьці тэхнічных кансультантаў.

Выходзіць, такім чынам, што яшчэ ёсьць сярод дзяржаўных служачых такія асобы, якія, ня гледзячы на асаблівыя клопаты дзяржавы аб іх, адказваюць на гэтыя клопаты чорнай няўдзячнасьцю.

Выходзіць, такім чынам, што ёсьць некаторыя служачыя дзяржаўных устаноў, якія абавязаны па сваім становішчы і прадастаўленым ім правох добрасумленна адносіцца да рабоча-сялянскай дзяржавы і бараніць яе інтарэсы, якія, тым ня менш, прымаюць удзел у шкодніцкіх актах.

Вось чаму, асабліва ў сувязі з выкрытымі за апошні час новымі актамі шкодніцтва, нельга ня вітаць надрукаваную сёньня пастанову ЦВК СССР. Гэтай пастановай прапанавана АДПУ ужываць права, якое прадастаўлена ёй пастановай ураду ад 15 лістапада 1923 г., з асаблівай строгасьцю ў адносінах тых служачых дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў, якія маюць дачыненьне да дывэрсій, падпалаў і іншых відаў шкодніцтва, дастасаваньнем у залежнасьці ад характару злачынстваў усіх мер рэпрэсій.

Прадажная зграя выбрала для сваёй падрыўной работы адзін з важнейшых вучасткаў нашага будаўніцтва — сельскую гаспадарку наогул, сялянскую калектыўную гаспадарку ў асаблівасьці. На што разьлічвала гэта контр-рэвалюцыйная банда? Яна бачыла, яна разумела, як сялянскія масы, якія вышлі на шырокую, новую, сьветлую дарогу калгаснага будаўніцтва, цягнуцца да новых ведаў, да новай тэхнікі, да агранамічнай навукі, да лепшых спосабаў арганізацыі новай, буйнай, грамадзкай сялянскай гаспадаркі. Яна бачыла як вобмацкам, прагна цягнуцца сялянскія рукі да гэтых новых крыніц сьвятла і ведаў. Яна разумела, з якой ахвотай будзе прынята гэтай абноўленай масай кожная парада, кожнае ўказаньне агранома, тэхніка, спэцыяліста. І вось у гэтыя працягнутыя, нявопытныя яшчэ рукі шайка агіднікаў, прыкрываючыся сваёй тэхнічнай кваліфікацыяй і становішчам дзяржаўных служачых, парашыла пакласьці камень, атручаны шкодніцтвам.

Апіраючыся на барацьбу рэштак недабітага кулацтва супроць калгасаў, арганізуючы гэту барацьбу, шкоднікі парашылі ў корані падарваць нашу ўжо надымаючую і ўмацоўваючую сялянскую гаспадарку. У тых раёнах, дзе ім удалося раскінуць свае сеці, яны ўзяліся за зьнішчэньне рабочай і прадукцыйнай жывёлы, за псаваньне трактараў і с.-г. машын, за разьвядзеньне пустазельля на калгасных і саўгасных палёх, за раскрадваньне калгаснага ўраджаю і іншай калгаснай маемасьці, за падпалы машынна-трактарных станцый і ільназаводаў.

Зьбіць з ног селяніна-труджаніка, які падняўся да новага жыцьця, зьбіць яго з ног неўраджаем, пустазельлем, асудзіць на голад селяніна і рабочага, жонак і дзяцей рабочых і сялян, зьвесьці на нішто посьпехі пяцігодкі і калгаснага будаўніцтва і гэтым самым аслабіць абараназдольнасьць краіны — вось якую мэту паставіла сабе выкрытая і жалезнай рукой пралетарскай дыктатуры ліквідаваная контр-рэвалюцыйная шайка.

Гэта цяпер цьвёрда павінны запамятаць кожны калгасьнік, кожны рабочы і зрабіць з гэтага адпаведныя вывады.

Хто сам крадзе або штурхае цябе на раскрадваньне дзяржаўнай або калгаснай маемасьці, — куды ён вядзе, каму ён дапамагае, чаго ён дабіваецца? Хіба выяўленыя на Украіне ўсяго за дзьве дэкады сьнежня звыш 700.000 пудоў збожжа, схаванага па ўказцы гэтых шкоднікаў і кулакоў ад дзяржавы і калгасьнікаў, ня сьведчаць аб тым, што рэшткі контр-рэвалюцыянэраў узяліся за падрыў дабрабыту сялян і дэзарганізацыю веснавой сяўбы?

Хто сам нядобрасумленна працуе, або падбухторвае цябе на нядобраякасную работу, — куды гэты чалавек вядзе, чыю волю ён выконвае?

Кожны калгасьнік, кожны рабочы яшчэ і яшчэ раз павінны з найвялікшай увагай аднесьціся да слоў тав. Сталіна, што «за нашымі труднасьцямі хаваюцца нашы клясавыя ворагі».

Больш пільнасьці, таварышы рабочыя і служачыя! Больш пільнасьці, таварышы калгасьнікі! Клясавы вораг са сваёй агентурай хаваецца ў вашых-жа радох і пад маскай добрапажаданасьці, ціхай сапай стараецца зрываць вашу працу, стараецца аслабіць вашу энэргію і вярнуць сабе сілу і ўладу.

Больш пільнасьці, таварышы камуністы! На кожным з нас у паасобку, на кожнай партыйнай ячэйцы, на кожнай партыйнай арганізацыі ляжыць важнейшая адказнасьць перад рабочай клясай і калгасным сялянствам.

Страта клясавай пільнасьці, неразуменьне асаблівасьцей і новых форм клясавай барацьбы ў сучасных умовах, няўменьне разгледзець і намацаць ворага, а ў асобных выпадках і простае зрастаньне з клясава-варожымі элемэнтамі, усё яшчэ сустракаюцца ня толькі сярод радавых вясковых камуністаў, але і сярод работнікаў дзяржаўных устаноў.

І адной з істотнейшых прычын гэтых ганебных фактаў зьяўляецца тое, што вельмі і вельмі многія партыйныя работнікі агідна па гэтай частцы адстаюць у справе аўладаньня тэхнікай, што дае магчымасьць шкоднікам вадзіць за нос такіх работнікаў у вусім, здавалася-б, нескладаных пытаньнях.

Такія камуністы сядзяць часамі, скажам, у зямельных апаратах, лічаць сябе кіраўнікамі, а на справе аказваюцца часта-густа ў сецях шкодніцкіх махінацый, бо гэтыя самазадаволеныя бюракраты не працуюць па-бальшавіцку, закасаўшы рукавы, ня кіруюць практычна!

Шкоднікі з ліквідаванай контр-рэвалюцыйнай шайкі, якія цалкам прызналі сваю віноўнасьць, на допыце проста паказалі, як іх яўна шкодніцкія прапановы і ўстаноўкі часамі **штампаваліся вось гэтакімі якраз гора-кіраўнікамі.**

З гэтай ганьбай неабходна рашуча пакончыць! Той не бальшавік, той нягодны быць у радох нашай партыі, хто сьлепа ідзе на павадзе ў любога прахвоста, хоць-бы ў самых складаных і спэцыфічных пытаньнях тэй-жа самай тэхнікі!

Паварот значнай часткі старой тэхнічнай інтэлігенцыі і ў тым ліку яе найбольш кваліфікаваных кадраў, які намеціўся два гады таму назад, сумленная работа гэтай часткі старых спэцыялістаў на працягу апошніх год лішні раз пацьвярджае, што ў асобе раскрытай шкодніцкай шайкі з ліку дзяржаўных служачых **мы маем справу з самым агалцелым атрэп'ем контр-рэвалюцыі.** І няма ніякага сумненьня ў тым, што рабочыя, калгасьнікі і ўсе сумленныя лепшыя элемэнты сярод савецкіх служачых **поўнасьцю ўхваляць тую заслужаную суровую кару, якая прыпала на галовы заклятых ворагаў працоўнага народу, поўнасьцю ўхваляць меры, намечаныя пастановай ЦВК СССР у адносінах да шкоднікаў, якія прабраліся ў дзяржаўны апарат!**

Умоцнім клясавую пільнасьць!

Пільней ахоўвайце грамадзкую (сацыялістычную) уласнасьць, чэсна і добрасумленна ахоўвайце інтарэсы рабоча-сялянскай дзяржавы!

НІЯКАЙ ЛІТАСЬЦІ ВОРАГАМ НАРОДУ!

(Скарочаная перадавая «Праўды», перададзеная па радыё).

НЕ ІГНАРАВАЦЬ АДНААСОБНІКА

„Папярэдзіць усе савецкія арганізацыі аб недапушчальнасьці ігнараваньня аднаасобнікаў пры выкананьні пасеўнага пляну і абавязацельстваў па здачы прадукцыі дзяржаве"

(З пастаноў сэсіі ЦВК СССР)

МАЎЧАЛЬНІКІ З РЭЧЫЦЫ

РЭЧЫЦА, 15. (Наш кар.).

Яшчэ ў пачатку сакавіка «Зьвязда» выкрыла апартуністычную практыку рэчыцкага райзямаддзелу. Работу райза можна ахарактарызаваць словамі — поўная бязьдзейнасьць і гніла-лібэральныя адносіны да сабатажнікаў сяўбы.

Загадчык райзямаддзелу Тамілаў пацьвердзіў, па сутнасьці, шкодніцкія пляны яравой сяўбы, паводле якіх значная частка высока якаснай палатнай зямлі адводзіцца пад папар.

Райком і райвыканком ні адным словам не адгукнуліся на сыгналы «Зьвязды». Між тым, райзямаддзел і па сёньняшні дзень зрывае падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі. Асабліва злачынную бязьдзейнасьць праяўляе райзямаддзел у падрыхтоўцы да сяўбы па аднаасобных гаспадарках.

Дакладныя пасеўпляны для большасьці сельсаветаў і на сёньняшні дзень не распрацаваны. У Маладускім сельсавеце пляны зьмяняліся амаль кожны дзень да самага апошняга часу. Толькі 12 сакавіка райзямаддзел і сельсавет, нарэшце, узяліся за даведзеньне заданьняў па сяўбе да двара. Калі-ж гэтыя заданьні будуць даведзены, так і невядома.

У Холмецкім сельсавеце і на сёньня яшчэ не ўстаноўлена пасеўная плошча яравых. Сельсавет што ні дзень прысылае новыя весткі і лічбы, якія рэзка разыходзяцца між сабой.

Як рэагуе райзямаддзел на гэты сабатаж сяўбы? Што ён зрабіў, каб праверыць сапраўднае становішча з пасеўнай плошчай у сельсавеце?

Нічога! Райзямаддзел нават не зазірнуў у сельсавет. Тамілаў адкрыта заяўляе, што:

— Ня буду я езьдзіць па сельсаветах і займацца праверкай.

А што ўяўляюць з сябе пасеўныя пляны райзямаддзелу? Мала таго, паводле гэтых пляноў значная частка пахаці адводзіцца пад... пустэчу. Пляны распрацаваны паводле прынцыпу: толькі-б засеяць. А што сеяць, якія культуры ў першую чаргу — пра гэта райзямаддзел зусім ня турбуецца. У Холмецкім сельсавеце, напрыклад, даведзены такія пляны, паводле якіх трэба засяваць усе культуры ў аднолькавых размерах.

Усім гэтым карыстаюцца кулацкія элемэнты. Яны разгортваюць шалёную агітацыю сярод аднаасобнікаў. З кулацкай агітацыяй, з сабатажам сяўбы ў раёне ніхто не змагаецца. У Холмецкім сельсавеце з 400 аднаасобных гаспадарак 106 адмовіліся падпісаць абавязацельствы па сяўбе. У вёсцы Калочын з 67 двароў пасеўныя падпіскі далі толькі 7.

Страхавыя фонды ня ссыпаны. Рамонт с.-г. інвэнтару зусім не разгорнут. Даволі ўказаць, што плян рамонту ў Ліскаўскім сельсавеце выкананы толькі на 15 проц.

Райком і РВК, паўтараем, маўчаць. Яны толькі пагражаюць Тамілаву бясконцымі вымовамі і... па-ранейшаму цацкаюцца з гэтым апартуністам.

Колькі яшчэ сыгналаў трэба рэчыцкім маўчальнікам?

Д — ч.

А РАЙЗА ВАСХВАЛЯЕ...

СЛУЦАК, 15. (Наш спэцкар.).

Случчына — адзін з нашых паўднёвых раёнаў — пачынае сяўбу яравых значна раней за іншыя раёны БССР. Да выхаду ў поле застаўся літаральна лічаны час. Сяўба — на парозе, аднак, падрыхтоўка да палявых работ праходзіць зусім нездавальняюча.

Гэта асабліва адчуваецца па аднаасобным сэктары. Ён займае ў раёне яшчэ даволі значнае месца (40 проц.).

І са ссыпкай страхфондаў, і з рамонтам с.-г. інвэнтару, і з даведзеньнем пасеўных абавязацельстваў — справы ў раёне трывожныя. Каб упэўніцца ў гэтым, варта хоць-бы выйсьці з раённага цэнтру і прайсьці паўтара кілёмэтра да вёскі Лучнікі.

Старшыня і сакратар Лучнікоўскага сельсавету (у гэтым сельсавеце аднаасобны сэктар займае 65 процантаў) з гонарам заяўляюць, што ў іх сельсавеце аднаасобнікі і страхфонды ссыпалі, і насеньне ачысьцілі

— Адным словам, нашы аднаасобнікі гатовы да сяўбы на ўсе сто...

Для пацьверджаньня сваіх заяў яны падсоўваюць зашмальцаваны ліст паперы, на якім рознымі почаркамі выведзены подпісы. Аказваецца, гэта паўтара месяца назад распісваліся аднаасобнікі ў тым, што яны ссыплюць насеньне. Вось гэтыя абяцаньні Лучнікоўскі сельсавет і лічыць «ссыпанымі страхфондамі».

Характэрна, што кажуць некаторыя аднаасобнікі:

— Прычапіліся неяк да мяне сельсаветчыкі, — заяўляе аднаасобнік Шахноўскі, — расьпішыся ды распішыся. Ну, я і расьпісаўся.

Выкананьня падпісаных абавязацельстваў не правяралі. Ходу ссыпкі страхавых фондаў не кантралявалі. Уся надзея была ўскладзена толькі на адны подпісы.

Вось што робіцца на адлегласьці 1½ клм. ад Слуцку. Ці ведае пра гэта райзямаддзел? Нічога падобнага. Слуцкі райза наадварот... васхваляе Лучнікоўскі сельсавет за... стопроцантную ссыпку страхавых фондаў.

Характэрнай у гэтым сэнсе зьяўляецца заява загадчыка слуцкага райзямаддзелу тав. Зэльдзіна:

— Дзе нам займацца зараз аднаасобнікамі, калі мы нават ніяк ня можам выявіць сапраўднага становішча са ссыпкай насеньня і рамонтам інвэнтару ў калгасах...

Наўрад ці патрэбны камэнтары!

М. Сакалоўскі.

ГАНЕБНЕЙШАЯ БЛІЗАРУКАСЬЦЬ

БАРЫСАЎ. (Наш спэцкар.).

Раённыя арганізацыі лічаць калгас **«РОЙ»**, Метчынскага сельсавету, адным з самых **ЛЕПШЫХ і ПЕРАДАВЫХ**. Асаблівую стараннасьць праяўляе газэта **«БАЛЬШАВІК БАРЫСАЎШЧЫНЫ»** — орган РК КП(б)Б. Хто-хто, а яна не шкадуе гарачых кампліментаў па адрасу гэтага калгасу.

У нумары «Бальшавіка Барысаўшчыны», прысьвечаным раённаму зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў, зьмяшчаецца спэцыяльны рапарт калгасу «Рой». У рапарце, між іншым, ідзе гутарка такая:

«У жорсткай барацьбе з клясавым ворагам — кулаком і яго агентурай, вырас і загартаваўся наш калгас».

Далей — бурныя абяцаньні аб тым, што «сяўбу мы спаткаем ва ўсеўзброеньні», плюс урачыстыя заявы аб поўнай ссыпцы насенфондаў і своечасовым рамонце с.-г. інвэнтару.

Такавы словы. А факты...

У калгас «Рой» пралезьлі кулацка-шкодніцкія элемэнты, якія адкрыта ашукваюць даверлівых раённых работнікаў.

Член праўленьня калгасу Абрамовіч — кулак. У грамадзянскую вайну ён быў цесна зьвязан з бела-польскімі акупантамі. Абрамовіч згнаіў у калгасе тысячу пудоў насеннай бульбы.

Рахункавод калгасу — кулак Ліхачоўскі Р. Ён разам са старшынёй калгасу Жыжнеўскім арганізаваў масавае раскрадваньне калгаснай маемасьці і грошай. Каб замесьці сьляды, шкоднікі зьнішчылі ўсе рахунковыя дакументы.

Самі калгасьнікі ня раз патрабавалі зьняць Ліхачоўскага з работы. Але ў яго знайшоўся абаронца — сакратар парт'ячэйкі Пятроўскі.

Пры непасрэдным удзеле загадчыка СТФ Грука ў калгасе зьнішчана і разбазарана 100 калгасных сьвіней. Разбазарап таксама ўвесь маладняк цялят.

Ня лепш і з насеньнем. Насенны лубін валяецца на двары, пад сьнегам. Іншае насеньне ляжыць у дзіравым сьвірні і таксама засыпана сьнегам. Два бурты насеннай бульбы (амаль 10 тон) памарожаны. Старшыня калгасу Жызьнеўскі сам пайсаваў амаль 12 цэнтн. бульбы. Член калгасу Ліхачоўскі М. утаіў і пайсаваў 100 пуд. насеннай бульбы.

32 тоны мінэральных угнаеньняў раскрадзены. С.-г. інвэнтар валяецца пад адкрытым небам. Машыны не адрамантаваны. Дыскавая сеялка разабрана, а часткі яе раскрадзены.

А вось, што ўяўляе з сябе калгасная ячэйка. Назавем толькі найбольш характэрных яе членаў.

Сакратар ячэйкі Пятроўскі — былы гвардзеец. Меў 25 дзесяцін зямлі. Актыўны абаронца кулацка-шкодніцкіх элемэнтаў. Ліхачоўскі Г. — былы... царкоўны стараста. Шуцкі В. — сын паліцэйскага, кулака. Шаблоўскі А. — самагоншчык і спэкулянт. І г. д., і г. д.

І вось, гэты калгас хваляць і раённая газэта, і райком, і райзямаддзел.

Між іншым, у раёне ведаюць пра ўсе факты, аб якіх мы гаварылі вышэй. Работнік рэдакцыі, член партыі Мішкін сам быў у калгасе «Рой». Вось яго заява:

— «Калгас «Рой» — добры калгас. А тое, што кіраўніцтва там клясава-чужое, што калгас засьмечан, гэта... іншая справа».

Факты, паданыя намі пацьвердзіла і райКК-РСІ. У сувязі з гэтым, РБК зьняла сакратара ячэйкі Пятроўскага з работы і... усё. Справа недапушчальна зацягваецца.

А тым часам, орган РК КП(б)Б «Бальшавік Барысаўшчыны» яшчэ пяе калгасу «Рой» гарачыя дыфірамбы, а райком і райзямаддзел лічаць гэты калгас... адным з лепшых.

А. С.

З ЧЫМ МЫ ІДЗЕМ У КАЛГАС

ЛІСТ ГРУПЫ АДНААСОБНІКАЎ РЫМАВЕЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ

З кожным днём мы ўсё больш пераконваемся на канкрэтных прыкладах нашых калгасаў, што адзіным шляхам для працоўнага сялянства зьяўляецца шлях калектывізацыі.

Возьмем калгас нашага сельсавету «Глуша». Калгасьнік Гутоўскі да ўступленьня ў с.-г. арцель «Глуша» меў серадняцкую гаспадарку. На сваіх вузкіх палосках ён ледзь-ледзь мог пракарміць сваю сям'ю. Не параўнаць, як жыве цяпер той-жа Гутоўскі ў калгасе. Сям'я Гутоўскага атрымала сёлета ў калгасе 67 пудоў збожжа, 10 пудоў пшаніцы, 27 пудоў ячменю, 10 пудоў аўса і 12 пудоў круп. Разам—125 пудоў збожжавых, 200 пудоў бульбы і 1.044 руб. грашыма.

Чаму-ж ня радавацца Гутоўскаму? Ніхто з нас, аднаасобнікаў, такога даходу ня мае. Гэта, між іншым, чысты даход Гутоўскага. Яму адсюль ня трэба здаваць збожжа на загатоўках і ссыпаць насеньня. Яго калгас ня толькі выканаў, але і перавыканаў плян збожжазагатовак. Насенфонды ссыпаны з перавышэньнем заданьня. На пашырэньне гаспадаркі вызначана 12 тыс. руб.

Або возьмем калгасьніка Ярошака Алеся, што з вялікай сям'ёй. Гэта пра яго кулакі гаварылі, нібы ён не заробіць нават і на пракорм сваёй сям'і. У Алеся трое дзяцей і хворая жонка. Адзін толькі ён працаздольны. І ўсё-ж Ярошак зарабіў столькі, што зараз хапае на ўвесь год. Ярошак атрымаў 50 пудоў збожжа, 100 пудоў бульбы, корм для жывёлы і 375 руб. грашыма.

Або возьмем удаву Янкоўскую. Яна атрымала 40 пудоў збожжа, 80 пудоў бульбы і 370 руб. грашыма.

Ці трэба яшчэ падаваць іншыя прыклады?

Мы, аднаасобнікі, сёньня канчаткова парашылі паступіць у калгас.

З чым мы ідзем туды?

На ўсю зямлю, якая лічыцца за намі, мы здаем у калгас насеньне добрай якасьці, абагульваем рабочых коняй і с.-г. інвэнтар. Абяцаем з першага-ж дня ўступленьня ў калгас сваячасова выходзіць на работу і працаваць сумленна, працаваць на сябе, на калгас. Даем слова, разам са старымі калгасьнікамі, па-бальшавіцку змагацца за павышэньне ўраджайнасьці.

Мы ведаем, што сярод аднаасобнікаў ёсьць нямала такіх, што разбазарылі або зьбіраюцца разбазарыць сваё насеньне, жывёлу і інвэнтар для таго, каб прыйсьці ў калгас з голымі рукамі.

Перад такімі аднаасобнікамі мы ставім пытаньне:

— Якім канём, якім інвэнтаром будзе апрацавана тая зямля, што перадаеце вы ў калгас? Якім насеньнем яна будзе засеяна?

Калгас ссыпаў насеньне на сваю зямлю, забясьпечыў яе цягавай сілай і інвэнтаром. Чаму-ж вы ня хочаце зрабіць гэтага? Таму, што некаторыя з вас трапілі на вудачку кулака, сталі на шлях спэкуляцыі.

І правільна калгасы робяць, што ня прымаюць такіх аднаасобнікаў у свае рады. Інакш і быць ня можа.

— Хочаш лепш жыць—выканай усе ўмовы, якія ставіць перад табой дзяржава: ссып насеньне, абагуль інвэнтар і цягавую сілу. Толькі тады можна будзе паверыць, што ты ідзеш у калгас сумленна працаваць.

Таварышы аднаасобнікі, для вас дзьверы ў калгас не зачынены.

Не чакайце далей, адкіньце ўсякія сумненьні і па нашаму прыкладу станавіцеся на адзіна правільны шлях, шлях калгасаў. Будзем разам са старымі калгасьнікамі, на адным полі змагацца за высокі ўраджай, за бальшавіцкае праводзеньне сяўбы яравых.

Пархімчык, Вышкоўскі, Ляшчук, Мацьвейчык, Гарнастай, Самсонаў, Станкевіч і г. д.

Усяго 53 подпісы.

Бабруйскі раён.

ШТАМПОЎШЧЫКІ

ВОРША, 15. (Наш кар.).

У Аршанскім райзямаддзеле хвалюцца... Работнікі райза ў адзін голас заяўляюць, што з падрыхтоўкай да сяўбы ўсё добра.

— Яшчэ 5-га студзеня пасеўныя пляны ў сельсаветы спусьцілі? — Спусьцілі!

— Блянкі на даводзеньні пасеўных абавязацельстваў да двара ў сельсаветы накіравалі? — Накіравалі!

— Дзесяцідворкі ў Якаўлевіцкім і іншых (?!) арганізавалі? — Арганізавалі!

Ну, хіба не сур'ёзныя аргументы?..

Што, аднак, хаваецца за гэтай балбатнёй у сапраўднасьці?

І аказваецца...

Пляны ў сельсаветы хоць і спушчаны, але да двароў не даведзены. Дзесяцідворкі арганізаваны толькі ў трох сельсаветах. Гэта з **32-х** сельсаветаў раёну.

Нават, паводле афіцыяльных зьвестак райзямаддзелу, страхавыя фонды ня ссыпаны. Даволі ўказаць, што адных толькі збожжавых ня ссыпана яшчэ 807 цэнтнэраў. На палі трэба вывезьці 8.000 вазоў гною. Вывезена... 338. Трэба адрамантаваць 2.729 плугоў. Адрамантавана толькі... 1.577.

Гэта — афіцыяльныя даныя са зводак аршанскага райзямаддзелу. Ці можна ім верыць?

Возьмем, напрыклад, Межаўскі сельсавет. Аб ссыпцы страхфондаў у зводцы райзямаддзелу, адна за аднэй зьмяшчаюцца паступныя лічбы:

14 студзеня — страхфонды ссыпаны ў разьмеры 25 цэнтн. збожжавых.

17 студзеня — 589,5 цэнтн. збожжавых і 64,45 цэнтн. тэхнічных культур.

20 студзеня — збожжавых — 0, тэхнічных — 0.

І, нарэшце, **9 сакавіка** — збожжавых — **42** цэнтн., тэхнічных — **0.**

А райком КП(б)Б, са свайго боку, штампуе апартуністычную бязьдзейнасьць аршанскага райзямаддзелу.

К.

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ КОНСКАЙ ЦЯГАВАЙ СІЛЫ ДА СЯЎБЫ

ПАСТАНОВА СНК БССР І ЦК КП(б)Б

Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б адзначаюць, што праверка выкананьня пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 10 лютага паказала зусім нездавальняючае становішча падрыхтоўкі рабочых коняй да веснавой пасеўнай кампаніі.

Наркамзем, Упаўнаркамсаўгасаў, саўгастрэсты, РК КП(б)Б, РВК і МТС не прынялі на справе канкрэтных мер да рэалізацыі пастановы ад 10 лютага і, фактычна, падрыхтоўкай жывой цягавай сілы да веснавой сяўбы не займаюцца.

У радзе саўгасаў і калгасаў пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ня толькі не рэалізавана, але не растлумачана рабочым саўгасаў і калгасьнікам.

У выніку бязьдзейнасьці і безадказных адносін да каня з боку раду праўленьняў калгасаў і дырэктароў саўгасаў, адсутнасьці клясавай пільнасьці да шкодніцкай работы клясава-варожых элемэнтаў, накіраванай на зьнясіленьне і зьнішчэньне конскага пагалоўя, наглядаюцца шматлікія выпадкі падзяжу коняй, драпежніцкага скарыстаньня іх на рабоце, калецтва, вымушаных абортаў, сьвядомага недакармленьня і непаеньня, перагонаў і апоўзу (калгасы «XIII-годзьдзе Кастрычніка», «Іскра», «Сьветлы шлях», саўгасы «Чырвоны Кастрычнік», «Ударнік», Чэрыкаўскага раёну, калгас «Пяцігодка ў чатыры гады», калгасы ... Дзяржынскага раёну, калгасы «Інтэрнацыянал» і «Сацыялістычная бацькаўшчына», Лёзьнянскага раёну, «Новы шлях», Асьвейскага раёну, «Серп і Молат», Нараўлянскага раёну, калгасы «Случ № 3», «Шляхі калектывізацыі» і саўгас «14 партызан», Слуцкага раёну і г. д.).

Ня гледзячы на простыя і ясныя дырэктывы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 10 лютага і рад дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб зьнішчэньні недахопаў у кармленьні, утрыманьні і догдядзе, да гэтага часу коні не разьбіты на групы па іх працаздольнасьці, не прымацаваны да пэўных конюхаў, рабочых саўгасаў і калгасьнікаў, працуючых на конях; дапускаюцца частыя зьмены ў прымацаваньні коняй; адсутнічае пастаянны распарадак работ на стайні, што прыводзіць да нерэгулярнага кармленьня, паеньня і адпачынку каня; ігнаруюцца элемэнтарныя правілы ўтрыманьня і догляду (чыстка, расчыстка капыт, сваячасовая коўка, утрыманьне ў стайках і на прывязі).

Практычныя работы па стварэньні кармовых фондаў для забесьпячэньня коняй на час пасеўнай кампаніі падмяняюцца апартуністычнымі разважаньнямі аб адсутнасьці кармоў, асабліва канцэнтраваных. Разам з гэтым у радзе калгасаў і саўгасаў, у якіх напружанае становішча з кармамі, расходаваньне кармоў праводзіцца неэканомна, бескантрольна і кармы проста расьцягваюцца антысавецкімі элемэнтамі на вачох праўленьняў калгасаў, адміністрацыі саўгасаў, партыйных ячэек і прафоргаў, што, па сутнасьці, зьяўляецца простай дапамогай антысавецкім элемэнтам у іх шкодніцкай рабоце.

Антысавецкая і антыкалгасная шкодніцкая работа клясава-варожых элемэнтаў незаўсёды сустракае рашучы адпор з боку партыйных ячэек, дырэктароў саўгасаў і праўленьняў калгасаў (саўгасы «Дзёмкіна», «Собалева», калгас «Непераможны», Дубровенскага раёну, і інш.).

Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Абвясьціць з 16 па 26 сакавіка дэкаднік праверкі рэалізацыі пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 10 лютага 1933 г.

Абавязаць РК КП(б)Б, РВК, РКК-РСІ шляхам пасылкі спэцыяльных упаўнаважаных у кожны калгас і саўгас, на аснове разгортваньня масавай работы сярод рабочых саўгасаў і калгасьнікаў, праверыць выкананьне пастановы ад 10 лютага і аказаць практычную дапамогу ў правядзеньні канкрэтных мерапрыемстваў, зьвязаных з падрыхтоўкай цягавай сілы да веснавой сяўбы.

Абавязаць камсамол, як шэфа над канём, распрацаваць і правесьці рад канкрэтных апэрацыйных мер у сувязі з дэкаднікам праверкі выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР.

2. Асноўнымі задачамі дэкадніка паставіць:

а) разьбіўку коняй па групах працаздольных і слабасільных і арганізацыю лепшага кармленьня, догляду слабасільных коняй з вызваленьнем іх ад усякіх работ, рашуча змагаючыся з імкненьнем клясавага ворага скарыстаць гэта мерапрыемства для зрыву чарговых гаспадарча-палітычных кампаній (вывазка ўгнаеньня, лесавывазка і г. д.);

б) стварэньне кармовых фондаў і арганізацыю правільнага расходаваньня, уліку і аховы кармоў; арганізацыю міжкалгаснай узаемадапамогі па між калгасамі, якія маюць лішкі грубых кармоў, і калгасамі, незабясьпечанымі кармамі;

в) падбор для работы на стайнях лепшых, правераных калгасьнікаў замест сацыяльна-чужых элемэнтаў і нядобрасумленных калгасьнікаў, якія не забясьпечваюць пасьляховай падрыхтоўкі коняй да веснавой сяўбы;

г) устанаўленьне на стайнях правіл унутранога распарадку, якія-б забясьпечвалі правільнае кармленьне, догляд і адпачынак коняй і нармальную нагрузку іх у часе работы ў адпаведнасьці з працаздольнасьцю;

д) прымацаваньне коняй да пэўных рабочых саўгасаў і калгасьнікаў на ўвесь перыяд с.-г. работ, падбор і рамонт упражы;

е) падрыхтоўку да злучной кампаніі і ахову жарэбных матак;

ж) арганізацыю грамадзкага кантролю ў саўгасах і калгасах за поўным ажыцьцяўленьнем пастановы ад 10 лютага.

3. Абавязаць Наркамзем і Упаўнаркамсаўгасаў у 3 дзенны тэрмін распрацаваць і распаўсюдзіць масавым тыражом прыкладныя правілы ўнутранога распарадку на стайнях у саўгасах і калгасах.

4. Прапанаваць рэдакцыям цэнтральных і раённых газэт наладзіць сыстэматычнае асьвятленьне ходу работ па падрыхтоўцы цягавай сілы да сяўбы і на прыкладзе канкрэтных калгасаў паказаць, як трэба арганізаваць утрыманьне, кармленьне і догляд коняй.

5. Абавязаць РК КП(б)Б, РВК і МТС пры складаньні вытворчых пляноў у калгасах асабліва дакладна прапрацаваць пытаньне аб увязцы работы коняй з трактарамі.

6. Прапанаваць пракурору рэспублікі забясьпечыць разгляд на працягу ня больш 5 дзён спраў наконт падзяжу коняй, драпежніцкіх адносін да іх і разбазарваньня кармовых фондаў.

7. Абавязаць Наркамзем, Упаўнаркамсаўгасаў, РВК, саўгастрэсты і МТС на працягу ўсяго часу падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы арганізаваць сыстэматычны нагляд і кантроль за становішчам конскай цягавай сілы ў парадку апэрацыйнай работы, неадкладна рэагуючы на кожны канкрэтны выпадак дрэннай пастаноўкі справы.

Устанавіць дакладную апэрацыйную справаздачу аб падрыхтоўцы цягавай сілы да веснавой сяўбы.

8. Абавязаць РК і РКК КП(б)Б не пазьней 28 сакавіка падвесьці вынікі правядзеньня дэкадніка і матар'ялы прадставіць ЦК КП(б)Б.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛА.

Лінейная калібровочная мішэнь LRT-BE4-V2

Работу кожнай МТМ ацэньваць па якасьці адрамантаваных машын

Менская майстэрня выпускае дрэннаадрамантаваныя трактары

Слуцкая МТМ з посьпехам скончыла рамонт

СЛУЦАК. (Наш спэцкор). «Зьвязда» ў свой час паведамляла аб нездавальняючым становішчы з рамонтам трактараў па Слуцкай МТС і МТМ. Прычыны адставаньня хаваліся ў дрэннай арганізацыі працы, у зусім слабай барацьбе за працоўную дысцыпліну, ва ўраўнілаўцы ў аплаце працы і г. д.

Сыгналы «Зьвязды» былі ўлічаны арганізацыямі МТС. Кіраўніцтва Слуцкай машынна-трактарнай станцыі здолела мабілізаваць рабочых на ліквідацыю прарыву. Былі выкрыты шкоднікі — браты Козакі, сыны жандара, якія тармазілі рамонт. Зьнят з работы прагульшчык Іванчанка.

Вялікая ўвага была зьвернута на палепшаньне работы сталоўкі. Значна палепшана абслугоўваньне ўдарнікаў.

За апошні час прывая рамонту сыстэматычна павышалася са дня ў дзень. На 6 сакавіка пры заданьні ў 50 трактараў было ўжо адрамантавана 40, што складае 80 проц. Калі ў лютым МТМ выпускала ў дзень ня больш 1 трактара, дык у апошнія дні яна выпускала 2-3. 6 сакавіка, напрыклад, пры заданьні ў 2 трактары, адрамантавана 3.

Нарастаньню тэмпаў рамонту значна дапамог шэф МТС і МТМ — менскі машынабудаўнічы завод імя **Варашылава.** Ён арганізаваў сацспаборніцтва па рамонце, брыгада заводу з 3-х чал. узяла майстэрні на буксір.

Заводская брыгада тав. **Варзніка** заключыла сацдагавор з брыгадай МТМ, якой кіруе тав. **Дубінка.** Паводле дагавору, брыгада тав. **Варзніка** абавязалася да 1 сакавіка выканаць заказы Крычаўскага цэмэнтнага заводу і выпусьціць 2 сушыльныя барабаны; брыгада Дубінкі ў сваю чаргу абавязалася адрамантаваць 12 трактараў і 4 маторы. На аснове гэтага дагавору, разгарнулася сацспаборніцтва паміж брыгадамі МТМ — **Якубовіча, Дзірача,** Дубінкі і інш.

1 сакавіка брыгада сушыльных барабанаў заводу імя Варашылава выканала ўзятыя на сябе абавязацельствы, выпусьціўшы два сушыльныя барабаны. Яна выслала ў МТМ свайго лепшага ўдарніка тав. **Багданава** для праверкі, як брыгада Дубінкі выканала пункты дагавору. Праверка паказала, што брыгада Дубінкі замест 12 трактараў і 4 матораў адрамантавала першых толькі 10 і другіх 4.

На сходзе рабочых МТМ тав. Багданаў падзяліўся вопытам работы заводу і заклікаў узьняць тэмпы рамонту. Сход пастанавіў дабіцца поўнага сканчэньня рамонту да 9 сакавіка.

На дапамогу брыгадзе Дубінкі прышлі ўдарнікі з мэханічнага цэху: т. т. **Канончык, Нядзелька і Рамаюўскі.** Яны ў свой час ужо выцягнулі з прарыву брыгаду Дзірача, якая была атрымала рагожны сьцяг за ганебныя тэмпы рамонту.

**

9 сакавіка МТС поўнасьцю скончыла рамонт трактараў, выпусьціўшы 32 машыны. Усе трактарысты замацаваліся за МТС на тры гады.

12 сакавіка ў выніку ўздыму сацыялістычнага спаборніцтва Слуцкая МТМ поўнасьцю выканала свае плянавыя заданьні па рамонту: адрамантавана 50 трактараў, 32 трактарныя плугі, 48 матораў.

Рабочыя майстэрань узялі на буксір Дамашавіцкую МТС і пасылаюць туды сваю брыгаду з 4-х чалавек.

Прыступлена да звышплянавай абточкі 11 калянчатых валаў для Плешчаніцкай МТС.

Рамантуецца звыш пляну трактар для саўгасу імя 14 партызан.

На 15 сакавіка вызначан пробны выезд трактараў у поле.

М. САКАЛОЎСКІ.

У баку ад вялікай справы

МАГІЛЕЎ. У горадзе існуе вялікая мэталапрацоўчая арцель, якая ўваходзіць у сыстэму прамкаапэрацыі. Арцель (інакш мэталякамбінат) яднае 163 рабочых розных кваліфікацый. Яна ня дрэнна абсталявана, мае 8 добрых такарных і некалькі страгальных варштатаў.

За апошні час камбінат асвоіў выраб новага тыпу машын—пачаў выпускаць лазавыя варштаты, якія раней увозіліся з-за межаў.

Аднак, лічбы выкананьня прамфінпляну за студзень і люты гавораць аб тым, што прадпрыемства поўнасьцю не нагружана. Сам старшыня праўленьня тав. **Сідарэнка** тлумачыць невыкананьне пляну адсутнасьцю заказаў.

Здаецца, што зараз, калі дадатковы выпуск запасных частак для трактараў набывае вялізарнае значэньне, праўленьне камбінату павінна было не чакаць пакуль паступяць заказы, а праявіць ініцыятыву і ўзяцца за рамонт трактараў і выраб запасных частак.

Гэтага не ўсьвядоміў старшыня праўленьня мэталякамбінату тав. **Сідарэнка.** Калі ў яго запыталіся: «ці можаце вы выпусьціць запасныя часткі», ён адказаў: «мы ня можам, у нас варштаты зношаны». Гэта яўная хлусьня. Члены арцелі, якія працуюць ля варштату, у адзін голас заяўляюць, што прадпрыемства мае ўсе магчымасьці вырабляць запасныя часткі. Думка рабочых падтрымана тэхнічным кіраўніком камбінату тав. **Бялецкім.**

З 8 такарных варштатаў, 6 могуць тачыць поршневыя кольцы, балты ўсякіх разьмераў, утулкі і інш. часткі. Над гэтым не задумалася праўленьне камбінату.

На двары прадпрыемства валяецца шмат кавалкаў жалеза, з якіх можна вырабіць тысячы лемехаў і адвалаў для плугоў. Але жалеза ляжыць пад сьнегам і іржавее.

Камбінат мае колавы цэх, які можа ўзяць на сябе рамонт фурманак ваколічных вёсак. Але кіраўнікі прадпрыемства нават не задумаліся над тым, каб паведаміць калгасы і аднаасобнікаў, што завод рамантуе калёсы. Гэта ў той час, калі з-за адсутнасьці сыравіны цэх нагружан толькі на 20-30 проц.

Паводле пастановы райкому, да мэталякамбінату прымацаваны два сельсаветы раёну. Ужо прайшлі тры тыдні, а кіраўнікі камбінату усё чакаюць, пакуль ім прывязуць машыны для рамонту з прымацаваных Машаніцкага і Хонаўскага сельсаветаў.

Людзі ня хочуць зразумець, што самае галоўнае зараз—гэта бальшавіцкая падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі.

Н. Н.

Выкрыць шкоднікаў

Перад намі два акты: адзін — камісіі с.-г. сэктару Белкаапсаюзу, другі — камісіі саўгасу «Лагаза», Менскага аддзяленьня трэсту «Сьвінавод». Абодва акты гавораць аб адным: аб АГІДНА-ЗЛАЧЫННЫХ АДНОСІНАХ МЕНСКАЙ МАШЫНА-ТРАКТАРНАЙ МАЙСТЭРНІ (Упаўн. НКсаўгасаў) да рамонту трактараў.

У майстэрнях не аддаюць ніякай увагі якасьці рамонту і выпускаюць машыны, якія пры першым-жа выпрабаваньні выходзяць са строю.

Майстэрні абавязаліся адрамантаваць трактар для калгасу гарбарні «БАЛЬШАВІК». Пры выпрабаваньні адрамантаванага трактара была выяўлена дрэнная зашплінтоўка поршневых пальцаў: у часе іспытаў яны выскачылі, папсавалі цыліндры матора, з-за дрэннай падгонкі падшыпнікаў бабіт даў шчыліну. Такім чынам трактар, які рамантаваўся каля 2-х месяцаў, быў зноў пастаўлен на капітальны рамонт.

8 сакавіка камісія з прадстаўнікоў саўгасу «Лагаза» і спэцыялістаў агледала свой трактар, адрамантаваны тымі-ж майстэрнямі. Пасьля 6 гадзін іспытаў трактар спыніў працу. Выявілася, што МТМ уставіла ў раму разьбіты матор, які потым даў шчыліну. Прышлося і гэты трактар здаць зноў у рамонт.

Камісія канстатавала, што падобная якасьць рамонту зьяўляецца вынікам злачынна-нядбайных адносін да работы з боку работнікаў МТМ.

Слова за сьледчымі органамі. Трэба праверыць склад работнікаў майстэрні і выявіць, чыя брудная рука дзейнічае ў МТМ, хто займаецца шкодніцкім рамонтам трактарнага парку.

Б.



Рамонт дыскавых барон у калгасе «1 мая».

Трактарны парк каапгасаў не падрыхтован да вясны

З 33-х трактараў, патрабуючых капітальнага рамонту, адрамантавана 15. Такія вынікі работы **каапгасаў БССР** на падрыхтоўцы мэханічнай цягавай сілы. Скончылі рамонт толькі некаторыя перадавыя МТМ і прадпрыемствы, якія абавязаліся прывесьці ў парадак машыны сваіх кааперацыйных гаспадарак. Так, завод імя Варашылава адрамантаваў 4 трактары, Бабруйскі лесакамбінат — 1 трактар і г. д.

Прыёмка адрамантаваных трактараў праводзілася спэцыяльнай камісіяй с.-г. сэктару Белкаапсаюзу з удзелам спэцыяліста Сельгаснабу. Камісія выявіла недобрасумленныя адносіны да работы Менскай МТМ. Выпрабаваньне трактара для калгасу гарбарні «Бальшавік» паказала вельмі дрэнную якасьць рамонту.

Трэба таксама адзначыць, што менская МТМ ігнаруе інтарэсы кааперацыйных гаспадарак. Яна павінна была скончыць рамонт да 1 сакавіка. Аднак, дагэтуль выпушчана толькі адна машына і тая з-за дрэннай якасьці работы пастаўлена на дадатковы рамонт, а дзьве другія яшчэ знаходзяцца ў «стадыі рамонту».

Нічога канкрэтнага не зрабілі кааперацыйныя гаспадаркі Магілеву, Бабруйску, Рэчыцы і Мазыру, дзе да рамонту амаль ня прыступлена. Як калгасы, так і заводзкія арганізацыі не аддаюць увагі гэтай справе, лічачы, што: «з рамонтам яшчэ пасьпеем». У Магілеве з 4-х машын не адрамантавана ні адна. Магілеўскі райза прымацаваў кааперацыйныя гаспадаркі да Несяцкай МТМ, якая знаходзіцца ў 150 клм. ад Магілеву.

Між тым у горадзе знаходзіцца мэталапрацоўчы завод «Чырвоны адраджэнец», які не загружан і мог-бы хутка адрамантаваць трактары для мясцовых каапэрацыйных гаспадарак.

У сувязі з тым, што Бабруйская, Рэчыцкая і Мазырская МТМ ня маюць магчымасьці тэрмінова адрамантаваць трактары для каапгасаў, с.-г. сэктар Белкаапсаюзу прапанаваў Бабруйску, Рэчыцы і Мазыру накіраваць трактары ў Менск на заводы імя Варашылава і «Камунар». Аднак, дагэтуль ні адзін трактар ня выслан.

Калі мясцовыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі зараз-жа ня прымуць рашучых мер, дык мэханічная цяга каапгасаў ня будзе падрыхтавана да выезду ў поле.

В. Л.

Вопыт, які трэба множыць

Случчына — важнейшы збожжавы раён БССР. Таму натуральна, што Слуцкі раён мае плян дзяржаўных збожжазакупак большы, чым іншыя раёны рэспублікі. У Случчыне шмат таварных лішкаў збожжа. Аднак, спажыўкаапэрацыя, якая вядзе збожжазакупкі, ня здолела з самага пачатку паставіць работу так, каб паказаць прыклад сельскай каапэрацыі іншых раёнаў.

Тлумачыцца гэта няправільнай арганізацыяй справы. Прыступіўшы да збожжазакупак, Слуцкі райсаюз абмежаваўся толькі адкрыцьцём закупачных пунктаў у местачковых цэнтрах, дзе ёсьць базары. Побач з пунктамі былі адкрыты прамтаварныя крамы, з якіх тавар адпускаўся прадаўцом збожжа дзяржаве. Каапэратары спадзяваліся, што збожжа пойдзе самацёкам і ня ўжылі ніякіх мер, каб арганізаваць закупкі.

Практыка першага тыдня паказала, што такія мэтады работы, стаўка на самацёк нічога не даюць. Збожжа якое прывозілася на рынак калгасьнікамі і аднаасобнікамі, звычайна трапляла ў рукі спэкулянтаў і перакупшчыкаў. Рэдка хто з сялян нават ведаў аб дзяржаўных закупках і выгадах ад продажу збожжа дзяржаве. Апарат закупачных пунктаў і райсаюз аб гэтым не паклапаціліся. Праўда, шмат калгасьнікаў і аднаасобнікаў даведаліся аб дзяржаўных збожжазакупках з газэт, але тут на сцэну выступіў кулак, які павёў агітацыю, што «збожжазакупкі—гэта другія збожжанарыхтоўкі», а, значыцца, «прадай хутчэй свае лішкі прыватніку».

Адсутнасьць арганізацыйна-масавай работы вакол дзяржаўных збожжазакупак на месцах спрыяла шкодніцкай дзейнасьці клясавага ворага. Дый работнікі пунктаў далёка ня ўсюды былі падабраны як належыць. Вось яркі прыклад. Калі адзін з калгасьнікаў зайшоў у прамтаварную краму Нова-Дварэцкага закупачнага пункту і запытаў «што гэта за тавары?»— прадавец адказаў: «Гэты тавар ня наш». Калгасьнік зьдзівіўся такому незразумеламу адказу і пайшоў. Прадавец не палічыў патрэбным растлумачыць селяніну прызначэньня прамтавараў і выгаднасьць продажу збожжа дзяржаве. Гэты работнік пункту, між іншым камсамолец, праявіў сябе тыповым бюракратам, чужым савецкай уладзе элемэнтам.

Нікчэмныя вынікі работы за першы тыдзень прымусілі райсаюз задумацца над правільнасьцю арганізацыі справы. І райсаюз прышоў да вываду, што адны пункты патрэбных рэзультатаў не дадуць і трэба спусьціцца ўніз—у калгас, у вёску. Не чакаць пакуль селянін прывязе збожжа на пункт, а **арганізаваць** збожжазакупкі. Зразумеўшы гэта, раённае кіраўніцтва знайшло неабходным прыцягнуць на дапамогу сельспажыўтаварыствы. Яно зусім правільна ўлічыла, што іменна сельспажыўтаварыства, цесна зьвязанае з калгасам, калгасьнікам і аднаасобнікам, павінна і можа адыграць вялікую ролю ў закупках збожжа.

У выглядзе вопыту Слуцкі райсаюз прыцягнуў усе свае сельспажыўтаварыствы да збожжазакупак на контрагенцкіх пачатках. Сутнасьць яго мэтаду заключаецца ў наступным. Пры сельспажыўтаварыствах не адкрываюцца ні закупачныя пункты, ні прамтаварныя крамы. Але сельспажыўтаварыства праводзіць арганізацыйна-масавую работу. Яно атрымлівае ад сялян даручэньне прадаць дзяржаве іх збожжавыя лішкі і купіць для іх поўныя прамтавары.

Там, дзе сельспажыўтаварыствы ўжо ўзяліся за работу, дасягнуты бліскучыя рэзультаты, ня гледзячы на тое, што з часу ўцягваньня сельскай каапэрацыі ў збожжазакупкі прайшло ўсяго некалькі дзён. Найбольш паказальная практыка **Серадзянкоўскага** сельспажыўтаварыства. На чале яго стаіць тав. **Кіявіцкі,** які карыстаецца вялікім аўтарытэтам і папулярнасьцю сярод мясцовага насельніцтва.

Тав. Кіявіцкі пачаў са склікання агульнага сходу калгасьнікаў і аднаасобнікаў. На гэтым сходзе была ўсебакова абгаворана пастанова ўраду аб збожжазакупках, а таксама паведамлены пра ўмовы закупкі, асартымэнт тавараў, якія ёсьць на пункце. Сходу была растлумачана палітычная сутнасьць дзяржаўных збожжазакупак, як мерапрыемства, накіраванага супроць кулакоў і спэкулянтаў, на палепшэньне рабочага снабжэньня і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Сельспажыўтаварыства не абмежавалася прапрацоўкаю пытаньня на агульным сходзе, а шляхам асабістых гутарак з паасобнымі калгасьнікамі і аднаасобнікамі шырока папулярызавала выгаднасьць продажу збожжавых лішкаў дзяржаве. У рэзультаце праведзенай работы насельніцтва сельсавету за тры дні праз сельспажыўтаварыства здало дзяржаве каля 25 тон збожжавых лішкаў.

Тав. Кіявіцкі адвёз збожжа на закупачны пункт, дзе закупіў заказаныя яму калгасьнікамі і аднаасобнікамі прамтавары. Сельспажыўтаварыства даставіла прадаўцом збожжавых лішкаў належачую колькасьць вострадэфіцытных прамтавараў. Звыш таго яно прывезла сялянам патрэбныя ім нядэфіцытныя тавары: вёдры, ацынкаваныя карыты, галаўныя хусткі і г. д.

Яркім прыкладам вялізарных магчымасьцяй сельспажыўтаварыстваў у правядзеньні дзяржаўных збожжазакупак служыць і **Лучнікоўскае** спажыўтаварыства. Праўленьне Лучнікоўскага калгасу было намерана прадаць дзяржаве толькі пару тон збожжа, а калгасьнікі і аднаасобнікі сельсавету вазілі свае лішкі на рынак, прадаючы іх нярэдка спэкулянту і перакупшчыку. Пераняўшы мэтады работы Серадзянкоўскага сельспажыўтаварыства, лучнікоўскія каапэратары ва працягу двух дзён дабіліся таго, што праўленьне калгасу прадало дзяржаве каля 8 тон збожжа, а калгасьнікі і аднаасобнікі, прыкладна, 13 тон.

Пададзеныя факты зьяўляюцца наглядным доказам правільнасьці новай установкі Слуцкага райсаюзу, парашыўшага пры правядзеньні збожжазакупак абаперціся галоўным чынам на сельспажыўтаварыствы, цесна зьвязаныя з насельніцтвам сваіх сельсаветаў. Праўда, у Случчыне сельспажыўтаварыствы непасрэдна ў сваіх крамах не вядуць збожжазакупачных апэрацый, але і вопыт прыцягненьня сельспажыўтаварыстваў на контрагенцкіх камісійных пачатках даў значныя рэзультаты.

Вывад напрошваецца сам сабою. Практыку работы Серадзянкоўскага і Лучнікоўскага сельспажыўтаварыстваў трэба шырока распаўсюдзіць.

В. Л.

Буржуазная прэса аб 50 гадавіне сьмерці К. Маркса

МАСКВА, 15. З усіх сталіц капіталістычных краін паступаюць весткі, што нават буржуазныя газэты адзначылі 50-ую гадавіну сьмерці Карла Маркса. Лёнданская «Таймс» прысьвяціла гадавіне сьмерці Маркса перадавы артыкул. Газэта, крытыкуючы марксызм, называе Маркса «вялікім мысьліцелем, які ўзварушыў мільёны». «Дэйлі Гэральд» зазначае, што «працы Маркса аказалі глыбокі рэвалюцыянізуючы ўплыў па канцэпцыі вялікіх мысьліцеляў, якія прыйшлі у жах, калі-б іх назвалі марксыстамі». Н'ю-ёркская «Дэйлі Уоркер», «Юманітэ» і інш. камуністычныя газэты або цалкам, або часткова прысьвечаны гадавіне сьмерці Маркса.

Адозва ЦК кампартыі Польшчы

ВАРШАВА, 14. Як паведамляе польская прэса, Цэнтральны Камітэт кампартыі Польшчы зьвярнуўся да Цэнтральнага Камітэту ППС і іншых сацыялістычных партый з прапановаю стварыць адзіны фронт барацьбы супроць наступленьня капіталу і фашызму. У прыватнасьці, ЦК кампартыі прапануе зараз-жа прыступіць да сумеснай арганізацыі ўсеагульнай аднадзеннай забастоўкі супроць ліквідацыі сацыяльнага забесьпячэньня, супроць наступленьня капіталу на ўмовы працы і зарплату рабочых, за выплату ўсім беспрацоўным дзяржаўных дапамог. У адозьве ЦК кампартыі ўказваецца, што супроць парушальнікаў умоў адзінага фронту будзе праводзіцца бязьлітасная барацьба, як супроць штрэйкбрэхэраў. У выпадку правядзеньня ў жыцьцё ўказаных умоў, ЦК кампартыі лічыць магчымым адмовіцца ад нападу на сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў час сумеснай барацьбы. У канцы адозвы ЦК кампартыі Польшчы выказвае ўпэўненасьць, што ўсе рабочыя, незалежна ад партыйнай прыналежнасьці, зараз-жа прыступяць да абраньня агульных камітэтаў барацьбы, не чакаючы адказу кіруючых органаў сацыялістычных партый.

Новы законапраект польскага ўраду

ВАРШАВА, 14. Урад унёс у сойм законапраект аб прадастаўленьні надзвычайных паўнамоцтваў прэзыдэнту рэспублікі на час соймавага адпачынку. Афіцыёз «Газэта польска» паведамляе, што можна ўжо ў бліжэйшыя дні чакаць закрыцьця сэсіі парляманту. Урадавы законапраект аб надзвычайных паўнамоцтвах матывуецца «напружанасьцю міжнароднага становішча». Камэнтуючы гэты законапраект, орган эндэкаў «Газэта варшавска» піша: «Само выступленьне ўраду з патрабаваньнем паўнамоцтва для прэзыдэнта нікога ня зьдзівіла... Сэнсацыю выклікала не само патрабаваньне, а аб'ём паўнамоцтваў. Яны ахопліваюць рашуча ўсё, што дапускае канстытуцыя, г. зн. усе зьмены ў галіне заканадаўства, за выключэньнем толькі самой канстытуцыі. Гэтага ня было яшчэ да гэтага часу ў Польшчы».

Афіцыёз «Газэта польска» піша:—«У абстаноўцы, калі сільныя гэтага сьвету» абмяркоўваюць у Жэнэве становішча, якое стварылася пасьля прыходу да ўлады Гітлера, польскі ўрад дэманструе сваю пільнасьць і гатоўнасьць «прымаць у найбольш хуткім парадку поўныя дзяржаўныя рашэньні».

Р. Выдра

ФАЛЬСЫФІКАЦЫЯ САЦЫЯЛ-ФАШЫЗМАМ ВУЧЭНЬНЯ МАРКСА—ЛЕНІНА АБ ДЫКТАТУРЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ*)

Галоўнае ў марксызме-ленінізме гэта пытаньне аб дыктатуры пралетарыяту. Пачынаючы з «Камуністычнага маніфэсту», і канчаючы апошнімі днямі свайго жыцьця, Маркс і Энгельс вылучалі на першы плян пытаньне аб дыктатуры пралетарыяту, выкарыстоўваючы для гэтага і вопыт рэвалюцыі 1848 г., і вопыт Парыскай Камуны і вопыт сваёй барацьбы з усімі апартуністычнымі кірункамі.

Ленін ня толькі захаваў у чыстаце вучэньне Маркса—Энгельса аб дыктатуры пралетарыяту ў змаганьні з міжнародным рэвізіянізмам, але і далей разьвіў гэта вучэньне на аснове гіганцкага вопыту рэвалюцыі 1905 г., лютага 1917 г., Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і сацыялістычнага будаўніцтва, на аснове вопыту разгорнутай міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі. Тав. Сталін у радзе сваіх прац выясьніў і асьвятліў тое вялізарнае багацьце, якое Ленін унёс у марксызм сваім разьвіцьцём і канкрэтызацыяй усіх пытаньняў, зьвязаных з дыктатурай пралетарыяту: «а) ён адкрыў савецкую ўладу, як дзяржаўную форму дыктатуры пралетарыяту, выкарыстаўшы для гэтага вопыт Парыскай Камуны і рускай рэвалюцыі; б) ён раскрыў дужкі ў формуле дыктатуры пралетарыяту з пункту гледжаньня праблемы аб саюзьніках пралетарыяту, вызначыўшы дыктатуру пралетарыяту, як асобную форму клясавага саюзу пралетарыяту, які зьяўляецца кіраўніком, з эксплёатаванымі масамі непралетарскіх клясаў (сялянства і інш.), якія зьяўляюцца кіруемымі; в) ён падкрэсьліў з асаблівай сілай той факт, што дыктатура пралетарыяту зьяўляецца вышэйшым тыпам дэмакратыі пры клясавым грамадзтве, формай пралетарскай дэмакратыі, выяўляючай інтарэсы большасьці (эксплёатуемых) у процівагу дэмакратыі капіталістычнай, выяўляючай інтарэсы меншасьці (эксплёататараў)» (Сталін, «Вопросы ленинизма», стар. 324-336, выд. 1930 г.).

Разам з тым тав. Сталін, кіруючы партыяй у змаганьні з правымі і «левымі» апартуністамі і з прымірэнцамі да іх, кіруючы разгромам контр-рэвалюцыйнага трацкізму, — далей праводзіць і разьвівае вучэньне Маркса—Леніна ў цэлым, вучэньне аб дыктатуры пралетарыяту ў асаблівасьці.

Ворагі марксызму-ленінізму ведаюць, што ў ім дыктатура пралетарыяту складае галоўнае, і таму яны ўсе сілы свае напружваюць для змаганьня — практычнага і тэарэтычнага—супроць дыктатуры пралетарыяту, працягваючы ў гэтай справе традыцыі главы рэвізіянізму Э. Бэрнштэйна.

Каўцкі адкрыта піша, што марксызм павінен быць рэвізован. У сваім надзвычайна раздутым, з дазволу сказаць, «Матэрыялістычным разуменьні гісторыі» (выданьне 1929 г.) ён проста заяўляе, падводзячы вынікі свайму пяцідзесяцігадоваму змаганьню з марксызмам:

«І так, час ад часу рэвізіі марксызму няўхільны, неабходны» (Каўцкі, «Матэрыялістычнае разуменьне гісторыі», том II, стар. 630).

І ўсю сілу сваю ён накіроўвае супроць вучэньня аб дыктатуры пралетарыяту. Каўцкі пускае ў ход нястрымную апалёгію капіталізму, агіднейшае распрыгожваньне буржуазнай дэмакратыі, запалохваньне ўсімі сіламі пекла, як сродак для ўтрыманьня мас ад пралетарскай рэвалюцыі і дыктатуры пралетарыяту, агіднейшы паклёп на СССР і г. д.

Перарастаньне Каўцкага ў сацыял-фашыста, у заўзятага ворага дыктатуры пралетарыяту не зьяўляецца выпадковым. У даўно мінулыя часы, яшчэ калі Каўцкі быў марксыстам, у яго ў зародкавай форме знаходзіліся тыя элемэнты, якія да гэтага часу далі такія пышныя, махровыя, контр-рэвалюцыйныя, сацыял-фашысцкія [illegible].

Ленін, разглядаючы «Сацыяльную рэвалюцыю» Каўцкага, якая адносіцца да 1903 г., адзначае ўжо ў гэтай брашуры зародак здрады Каўцкага галоўнаму ў марксызме-ленінізме — дыктатуры пралетарыяту:

«... аўтар увесь час гаворыць наогул аб «дзяржаве»..., аб «заваяваньні пралетарскай улады», пралетарыятам, аб «пралетарскай рэвалюцыі», аб «пралетарскім рэжыме»..., не гаворачы аб задачы «разьбіць бюракратычна-ваенную машыну», аб «зьнішчэньні дзяржавы», нават ні слова аб змаганьні з «забабоннай верай у дзяржаву» (Ленін. «Марксызм і дзяржава», стар. 78).

Ужо тады Каўцкі пісаў аб «імкненьні заваяваць дзяржаўную машыну», наконт чаго Ленін указвае, што гэта «крок назад ад 1852-1891 да 1847 г.» (Там-жа).

Падагульваючы разгляд другой брашуры Каўцкага (выд. 1909 г) «Шлях да ўлады», Ленін піша: «Вынік: увесь час аб «рэвалюцыі», асабліва аб «палітычнай рэвалюцыі», і нічога аб канкрэтызацыі яе ў Маркса і Энгельса ў 1852, 1871, 1891 г. г. Нічога аб «разьбіцьці», аб «паразыце-дзяржаве», аб замене парлямантскіх установаў працуючымі» (тамжа, стар. 83).

Такім чынам, Ленін вельмі ясна ўскрывае зародкі здрадніцтва Каўцкага. Цяпер, калі Каўцкаму трэба «тэарытычна ўгрунтаваць» свае заклікі да інтэрвэнцыі супроць адзінай краіны дыктатуры пралетарыяту, супроць СССР, цяпер, калі камуністычная партыя Германіі падводзіць пралетарыят да рашаючых баёў за дыктатуру пралетарыяту, — Каўцкаму мала замоўчваць, абыходзіць пытаньне аб дыктатуры пралетарыяту, распрацоўку яго Марксам—Энгельсам—Леніным. Цяпер трэба ўзяць усе тэксты Маркса—Энгельса і скавіць іх да непазнаванасьці, вытруціць з іх начыста рэвалюцыйны зьмест і ператварыць у процілегласьць — у нястрымную апалёгію буржуазнай дэмакратыі.

Каўцкі, зразумела, ведае напамяць усе тэксты Маркса. Ён упрыгуе ліст Маркса да Кугельмана ад 12-IV 1871 г., дзе Маркс гаворыць аб неабходнасьці разьбіць буржуазную дзяржаўную машыну, «а не перадаць з рук у рукі бюракратычна-ваенны апарат».

Але... для Каўцкага адразу ўзьнікае «але»:

«Тут зусім ясна відаць, — гаворыць Каўцкі, што Маркс разумеў пад «бліжайшай установай», пад «паразытычным целам», якое павінна было быць разьбіта ў бліжэйшай (пасьля 1848 г.) рэвалюцыі: не дзяржаву, а бюракратычна-мілітарысцкі апарат, значыцца, асобная дзяржаўная форма іменна бюракратычнай ваеннай манархіі». (Там-жа, стар. 55).

І жульніцкі фокус гатоў — разьбіваць трэба апарат ваеннай манархіі, а буржуазная дзяржава павінна застацца ў поўнай недатыкальнасьці.

І хаця Маркс самым вычарпальным чынам паказвае буржуазную дзяржаву, як дасканалую машыну па прыдушэньні эксплёатуемых мас — «пасьля кожнай рэвалюцыі, якая азначае крок наперад у разьвіцьці клясавай барацьбы, усё больш адкрыта выступае чыста прыгнятальны характар дзяржаўнай ўлады» (Маркс, «Грамадзянская вайна ва Францыі»), — Каўцкі ўсё такі мае нахабнасьць сьцьвярджаць:

«І так, Маркс зноў падкрэсьлівае, як бліжэйшую практычную мэту пралетарыяту, не скасаваньне дзяржавы, а замену бюракратычнай ваеннай манархіі сапраўды дэмакратычнай рэспублікай». (Там-жа, стар. 57).

Паўтараючы лжывы свой «довад», што ў Маркса дыктатура пралетарыяту — толькі слоўца, якое «выпадкова вырвалася» (К. II, 469), Каўцкі прабуе пусьціцца ў больш «сур'ёзную» аргументацыю.

«Гэта (дыктатура пралетарыяту — **Р. В.**) знаходзілася-б у супярэчнасьці з асноўным палажэньнем, высунутым на чале статуту І Інтэрнацыяналу і згодна якога вызваленьне рабочае клясы павінна быць справай самой рабочай клясы, а не неабмежаванага ўраду, які-б самавольна камандаваў рабочымі». (К. II, 470).

Каўцкі пыхае шулерскага прыёму — замены панаваньня ўлады рабочых слоўкам «урад» наогул, дыктатарствам наогул, тэрарызмам наогул выкідае клясавы зьмест дыктатуры, зводзячы справу да ўлюбёнай сваёй процілегласьці міру і гвалту, дэмакратыі і дыктатуры, г. зн. да таго, што так неабходна яму для выкананьня ролі прыслужніка буржуазіі.

Характэрна адзначыць, як Троцкі, цяпер правадыр перадавога атраду контр-рэвалюцыйнай буржуазіі, у свой час, выпускаючы сваю брашуру «Терроризм и коммунизм», ужо тады рабіў бліжэйшыя ўслугі Каўцкаму ў пытаньні аб дыктатуры пралетарыяту.

Нават у час барацьбы Троцкага супроць Каўцкага, у часе напісаньня «Терроризма и коммунизма», Троцкі па сутнасьці справы стаяў на каўцкіянскіх пазыцыях па пытаньні аб дыктатуры пралетарыяту.

І сапраўды, у чым заключаецца пятая пасылка Каўцкага ў адносінах да дыктатуры пралетарыяту? У адкрытым адмаўленьні яе, у адкрытай, жорсткай штодзённай барацьбе супроць яе, як супроць СССР, так і супроць дыктатуры пралетарыяту ў Германіі. Супроць чаго змагаецца Каўцкі? Супроць таго, каб пралетарыят гвалтоўным, рэвалюцыйным шляхам зламаў, разьбіў буржуазны дзяржаўны апарат, а не прабаваў аўладаць ім у гатовым выглядзе, супроць таго, каб пралетарыят, разьбіўшы буржуазны дзяржаўны апарат, стварыў свой уласны дзяржаўны апарат для задушэньня супраціўленьня эксплёататарскіх клясаў, для далучэньня да сябе шырокіх мас працоўных і эксплёатаваных у справе задушэньня эксплёататараў, у справе ліквідацыі клясаў і пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Паглядзім, якава тэарытычная пазыцыя Троцкага. Што пісаў Троцкі «супроць» Каўцкага?

«... калі задачу бачыць у зьнішчэньні прыватнай уласнасьці на сродкі вытворчасьці, то адзіным шляхам да яе вырашэньня зьяўляецца **сканцэнтраваньне ўсёй паўнаты дзяржаўнай улады** ў руках пралетарыяту, стварэньне на пераходны перыяд такога выключнага рэжыму, пры якім пануючая кляса кіруецца не **агульнымі нормамі,** разьлічанымі на доўгі перыяд, а меркаваньнямі рэвалюцыйнай мэтазгоднасьці» (Троцкі, «Терроризм и коммунизм», старонка 23, падкрэсьлена мною — **Р. В.**).

На тэй-жа старонцы ён піша аб «аўладаньні пралетарыятам матар'яльным апаратам улады». Далей шаўтарае: «Шлях адзін: вырваць уладу, адабраўшы ад буржуазіі матар'яльны апарат панаваньня» (стар. 39, там-жа).

У чым тут справа? Справа ў тым, што Троцкі нідзе не гаворыць аб неабходнасьці разьбіць буржуазную дзяржаўную машыну, а гаворыць, наадварот, аб «аўладаньні матар'яльным апаратам улады», аб адабраньні ў буржуазіі матар'яльнага апарату панаваньня. Троцкі зусім скажае марксыцка-ленінскае разуменьне буржуазнай дзяржаўнай машыны. Ён не разумее таго, што яна ёсьць ні што іншае, як армія, якую трэба разлажыць, як паліцыя, якую трэба разьбіць, як усякага роду бюракратычныя ўстановы (і парлямант, і суд і інш.), якія трэба разьбіць, разагнаць і г. д. Што з усім гэтым рабіць — Троцкі не гаворыць. Ён ня бачыць **клясавай арганізацыі,** ён ня бачыць **людзей,** ён бачыць толькі «матар'яльны апарат улады», г. зн. стрэльбы, гарматы і ўсякага роду ўзбраеньні. Само сабой зразумела, што пралетарыят павінен узброіцца і разброіць эксплёататараў. Але Троцкі нічога не гаворыць, што з гэтай зброяй рабіць, што яе трэба выкарыстаць для разьбіцьця буржуазнай дзяржаўнай машыны і стварэньня сваёй — дзяржавы дыктатуры пралетарыяту.

Як стаіць справа з дыктатурай пралетарыяту з пункту гледжаньня марксызму-ленінізму? Дыктатура пралетарыяту ёсьць улада рабочых над буржуазіяй, якая не апіраецца ні на які закон, а выключна на прымус. Ці ўключае гэта дыктатура і тэрор? Вядома, уключае.

Як зрабіў рэнэгат Каўцкі? Ён пастараўся замаскаваць сваю барацьбу супроць дыктатуры пралетарыяту гутаркамі наконт тэрарызму і камунізму, наконт «чыстай» дэмакратыі і інш. Рэнэгат Каўцкі скажаў цалкам вучэньне Маркса-Леніна аб дэмакратыі. Паводле Каўцкага, калі большая частка народу — рабочыя і працоўныя — пускаюць у ход тэрор супроць эксплёататараў, то гэта — недэмакратычна. Паводле Маркса і Леніна гэта якраз — вышэйшы выраз дэмакратызму.

Што зрабіў з Каўцкім Ленін? Ён выкрыў яго, як вялізарнейшага рэнэгата, перад якім рэнэгат Бэрнштэйн зьяўляецца «простым шчанюком». Ленін выкрыў барацьбу Каўцкага, як барацьбу іменна супроць дыктатуры пралетарыяту за дыктатуру буржуазіі.

А Троцкі? Ён прыняў гутаркі Каўцкага за чыстую манэту і абрушыўся сваім «Тэрарызмам і камунізмам». Аднак, увесь удар быў накіраван на адмаўленьне Каўцкім тэрарызму, а не на адмаўленьне ім дыктатуры пралетарыяту. Што-ж датычыць яе, то ў радзе важнейшых пытаньняў Троцкі па сутнасьці стаяў на пункце гледжаньня рэнэгата Каўцкага.

У кнізе Троцкага «Терроризм и коммунизм» ёсьць погляды, якія ў сваім разьвіцьці ператварылі трацкізм у перадавы атрад контр-рэвалюцыйнай буржуазіі.

Вернемся, аднак, да Каўцкага. Выплюнуўшы ўсю сваю атрутную сьліну на ненавісную яму дыктатуру пралетарыяту, Каўцкі прымаецца за размалёўваньне на бясконцыя лады буржуазнай дэмакратыі.

«Прэса, партыя, парлямант... Гэтыя тры «П» — вялікія органы сучаснай дэмакратыі» (К. II, 463).

Калі рабочыя ня маюць магчымасьці выдаваць сваю штодзённую прэсу, то Каўцкі знаходзіць для іх выгодны выхад, — калі ня кожны дзень, то можна раз у тыдзень. Верны служка буржуазіі, ён спакойна растлумачвае:

«Яны (штотыднёвікі) не патрабуюць такога дарага каштуючага апарату, як штодзённая газэта...»

Таньненькая, «даступная» нядзельная газэта — вось што Каўцкі раіць рабочым.

А ад нядзелі да нядзелі можна прадаставіць поле для разбэшчанай хлусьні, паклёпаў, імпэрыялістычнай прапаганды буржуазных наёмных пісак і іх лёкаяў сацыял-фашыстаў.

Каўцкі, як і ўсе сацыял-фашысты, вельмі добра сябе адчувае ў «дарага каштуючым» апараце буржуазнай дэмакратыі.

Заклікаючы сумесна з Баўэрам, Гільфэрдынгам і інш. да мірнага ўрастаньня «старога сьвінства» ў сацыялізм, Каўцкі, аднак, не адмаўляецца ад... грамадзянскай вайны і дыктатуры.

Грамадзянская вайна? Дыктатура?

Так, але за... буржуазную дэмакратыю. «Але барацьба, якую ў такім выпадку прыйшлося-б весьці, была-б ні чым іншым, як барацьбой за дэмакратыю» (475).

Як выглядае гэта «пагроза» Каўцкага, відаць з усіх паводзін германскіх с.-д., якія падрыхтоўвалі глебу для фашысцкай дыктатуры ў Германіі і імкнуцца з усіх сіл прыладзіцца ў якасьці неадлучнай, арганічнай часткі яе. Грамадзянская вайна, дыктатура пралетарыяту? Не! Вайна рэвалюцыйнаму пралетарыяту, дыктатура крывавага Носке, дыктатура Гітлера — вось што прапаведуе Каўцкі.

І гэта знаходзіцца ў поўнай згодзе з шалёнай злосьцю, нянавісьцю і паклёпамі, якія Каўцкі, Баўэр і іншыя лідэры II Інтэрнацыяналу распаўсюджваюць пра СССР, каб затрымаць бурны рост рэвалюцыйнага руху ў капіталістычных краінах, каб апаганіць тэорыю Маркса-Леніна аб дыктатуры пралетарыяту.

«Існуючы бальшавіцкі рэжым грунтуецца і ўнутры і звонку на ваенным прымусе» (К. II, 445).

«Ён (бальшавіцкі рэжым) ня можа прывесьці да дэмакратычнага ажыцьцяўленьня ўсебаковага самавызначэньня народаў» (К. II, 445).

І гэта Каўцкі адважваецца пісаць аб краіне, у якой ня толькі зьнішчан нацыянальна-каланіяльны ўціск расійскіх памешчыкаў і буржуазіі ў адносінах другіх народаў, населяўшых раней царскую Расію, гэту турму народаў, — Каўцкі адважваецца пісаць гэта аб СССР, у якім ня толькі ажыцьцёўлена на справе і як ніколі ў гісторыі права нацый на самавызначэньне аж да аддзяленьня, але ў якім вырашаецца з посьпехам задача, на якую здолен толькі пераможны пралетарыят, — задача зьнішчэньня фактычнай няроўнасьці, фактычнай адсталасьці працоўных мас раней прыгнечаных царскім рэжымам нацый, задача ліквідацыі іх тэхніка-эканамічнай адсталасьці, ператварэньня іх у перадавыя ва ўсіх адносінах краіны з росквітам культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесце.

**

На XII пленуме ВККІ тав. Мануільскі шырока разгарнуў сьпіс здрадніцтваў і злачынстваў с.-д. партый, кіраваных Ота Баўэрам, Каўцкім і К°. За гэтых час да сьпісу прыбавілася новая здрада германскіх с.-д. — іх поўная капітуляцыя перад Гітлерам, перад фашысцкай дыктатурай, іх імкненьне за што-б там ні стала ўжыцца ў ёй. Няма ніякага сумненьня, што і Баўэр і Каўцкі і К° прыцягнуць «няўхільную, неабходную рэвізію марксызму», пусьцяць новую порцыю «тэарытычнага» пылу, каб затуманіць вочы рабочых і прымусіць іх схіліць галовы пад меч фашысцкай дыктатуры.

Але... ня тыя часы. Посьпехі і перамогі пралетарыяту Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, шпарка раскрываюць сацыял-фашысцкі дурман, і ідэі Маркса-Леніна-Сталіна пракладаюць сабе дарогу да найшырэйшых мас міжнароднага пралетарыяту.

*) Урывак з кнігі «Фальсыфікацыя марксызму сучасным сацыял-фашызмам», падрыхтаванай да друку.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Справа не у „адсутнасьці ільну", а у адсутнасьці барацьбы за лён

6,7 проц. гадавога пляну ільназагатовак выканаць у два-тры дні!

16-га сакавіка

За цэлы месяц прырост у выкананьні гадавога пляну ільназагатовак па рэспубліцы складае ўсяго 5-6 проц. Дзяржаве недадана яшчэ каля 18 тыс. цэнтн. ільну.

Такое становішча зусім недапушчальнае. Апошні тэрмін завяршэньня ільназагатовак скончыўся яшчэ 1 сакавіка. Аднак, прайшло яшчэ 2 тыдні, «а воз и ныне там». Гадавы плян выканан толькі на 93,3 проц. У большасьці раёнаў загатоўкі фактычна спынены.

Возьмем Бушацкі раён. За цэлы месяц раённыя арганізацыі «дабіліся» прыросту ўсяго на 5 проц. У раёне паверылі сьлязьлівым кулацкім заяўленьням, што «ільну няма, усё ўжо здана дзяржаве». Якая цана гэтым кулацкім правакацыйным настроям, наколькі яны адпавядаюць сапраўднасьці, сьведчаць матар'ялы аб Бушацкім раёне, якія мы сёньня друкуем.

Або, вось, Горацкі раён. На 18 лютага плян быў выканан на 84,9 проц., а на 14 сакавіка — на 89 проц. Прырост, такім чынам, за цэлы месяц складае 4,1 проц. Па Асьвейскім раёне прырост за месяц—7 проц. «Рэкорд» пабілі Мсьціслаўскі раён, дзе прырост за месяц складае 1 проц., Дубровенскі—0,8 проц., Расонскі—2,7 проц.

Абсалютна спыніў загатоўкі Сіроцінскі раён. Тут за апошні час ніякага амаль ніякага прыросту.

Між тым, гэта ільнаводчыя раёны, якія вырашаюць лёс агульна-рэспубліканскага ільназагатоўчага пляну. Партарганізацыі гэтых раёнаў павінны быць асабліва адказнымі за ільназагатоўкі, мабілізаваць усю энэргію, усе сілы на поўную ліквідацыю запазычанасьці перад дзяржавай.

Сёньня мы публікуем пастанову ЦК КП(б)Б «Аб рабоце Сіроцінскай партарганізацыі па правядзеньні пасеву, уборкі і загатовак ільну 1932-33 г.». Гэта пастанова павінна паслужыць суровым папярэджаньнем для ўсіх партарганізацый БССР. Яны павінны памятаць, што пасеў, уборка і загатоўкі ільну—баявы экзамэн, па якім партыя будзе меркаваць аб баяздольнасьці тэй ці іншай арганізацыі ажыцьцяўляць яе генэральную лінію, змагацца за пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва.

Засталося выканаць яшчэ 6,7 проц. гадавога пляну. Мы павінны даць гэтыя апошнія процанты не пазьней, чым у два-тры дні. Канчаткова разграміўшы кулацкі сабатаж, ачысьціўшы рады партыі ад кулацкай агентуры—буржуазных перараджэнцаў, мабілізаваўшы шырокія масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і серадняком, партарганізацыя БССР даб'ецца канчатковай перамогі на ільназагатоўчым фронце.

НІ КОЛЬКАСЬЦІ, НІ ЯКАСЬЦІ...

КЛІЧАЎ.

На 10 сакавіка Клічаўскі раён выканаў плян ільназагатовак толькі на 78,5 проц. Аднак, гэта не перашкодзіла раённым арганізацыям і сельсаветам дэмабілізавацца, спыніць загатоўчую работу. За цэлую дэкаду прырост складае ўсяго 2,8 проц. Былі дні, калі паступленьне ільну не перавышала 0,05—0,1 проц.

У радзе калгасаў дагэтуль яшчэ існуюць кулацкія тэндэнцыі спачатку забясьпечыць сябе, а потым, калі застанецца, здаць дзяржаве. Паасобныя члены партыі ў Ваявіцкім сельсавеце замест таго, каб разьбіць кулацкі сабатаж, самі ігнаруюць здачу ільну дзяржаве. Старшыня калгасу «Колас», сабраўшы ўраджай у 2.748 снапоў, 2.507 раздаў калгасьнікам па працаднёх і толькі 241 сноп апрацаваў і здаў дзяржаве, прычым якасьць зданага ільну нікуды ня варта. Ясна, што калгас сарваў заданьне.

Усохскі сельсавет выканаў плян толькі на 15,5 проц., Запольскі—на 29,3 проц. Гэтыя лічбы—сьведчаньне недаацэнкі важнасьці ільназагатовак, сьвядомага сабатажу іх. Кіраўнікі гэтых сельсаветаў поўнасьцю падпалі пад уплыў кулака і фактычна дапамагаюць яму ў шкодніцкай антысавецкай дзейнасьці, у зрыве загатовак.

Кантора Загатільну не мабілізавала загатоўчага апарату на барацьбу за лён. На якасьць прадукцыі тут зусім не зварачалі ўвагі. Прымалі лён дрэнна апрацаваны, ніякай якасьці. Потым яго прышлося пераапрацоўваць і ў выніку процант выкананьня зьніжаўся. Так на 28 сьнежня 1932 г., паводле афіцыяльных даных, заданьне было выканана на 78 проц. Але пры ўліку якасьці гэты процант зьнізіўся да 61,2. Іншымі словамі, гэта была стаўка на «очковтирательство», на простае ашуканства партыйных і савецкіх арганізацый з боку райканторы Загатільну.

Нават і зараз, ня гледзячы на шматлікія катэгарычныя дырэктывы, рад прыёмачных пунктаў не зварачае ўвагі на якасьць ільну ганяецца выключна за колькасьцю. Да такіх пунктаў адносяцца Ваявіцкі, Наталаўскі, Уладзіміраўскі, Грыбавецкі, Даўжанскі і інш. Для таго, каб утаіць беззаконную прыёмку нізкаякаснага ільну, гэтыя пункты выдаюць квітанцыі здатчыкам ільну, ня ўказваючы якасьці зданай прадукцыі.

Г. Арт.

ПРАЎЛЕНЬНЕ БЫЛО СУПРОЦЬ...

У Бушацкай раённай газэце «Прымежны калгасьнік» паведамляецца аб вельмі характэрным факце, які выкрывае кулацкую сутнасьць заяў гора-загатоўшчыкаў, што, «ільну няма, плян выканаць немагчыма». Калгас імя Сьвярдлова, Чарапоўшчынскага сельсавету, перадаў дзяржаве 12 цэнтнэраў ільну. Аказалася, што загатоўкі сабатуе актыўна праўленьне калгасу на чале са старшынёй Полазавым Лук'янам. Праўленьне разбазарыла 10 цэнт. ільну, а потым разгарнула агітацыю, што «плян нерэальны, ільну няма». З гэтай заявай старшыня калгасу выступіў адкрыта на агульным сходзе калгасьнікаў.

Але калгасьнікі далі рашучы адпор сабатажнікам загатовак і заявілі: «Лён ёсьць, мы здамо кожны па 2-3 кілгр. і поўнасьцю ліквідуем запазычанасьць перад дзяржавай». Так і пастанавілі. І толькі старшыня калгасу і члены праўленьня былі супроць пастановы аб поўным выкананьні пляну ільназагатовак. Наўрад ці трэба даказваць, што праўленьне калгасу неабходна рашуча ачысьціць ад кулацкай агентуры.

Па раёну плян выканан на 86,5 проц. Можна было-б даўно ўжо завяршыць загатоўкі, калі-б не дэмабілізацыйныя настроі, самазаспакоенасьць кіраўнікоў сельсаветаў, парт'ячэек і раённых загатоўчых арганізацый. Гэта-ж факт, што за апошнія дні на загатоўчыя пункты не паступае ні аднаго кілёграму ільну. І галоўнае, што ў раёне да гэтага прывыклі, махнулі рукой.

М.-Далецкі сельсавет выканаў гадавое заданьне на 62,4 проц., Вясьніцкі на 67,3 проц., Чарапоўшчынскі на 72 проц. Гэтыя адстаючыя сельсаветы, як відаць, нават і ня думаюць ушчыльніць загатоўкі, дабіцца поўнага выкананьня пляну. Бо інакш чым вытлумачыць, што здача ільну па гэтых сельсаветах зусім спынена.

Як працуе раённая кантора Загатільну? Яна ня толькі ня кіруе загатоўкамі, ня толькі не вядзе ніякай практычнай работы ў сельсаветах і калгасах, але нават ня здолела наладзіць правільнага апэратыўнага ўліку загатовак. Райкантора Загатільну сваімі блытанымі лічбамі і зводкамі дэзарыентуе сельсаветы, дэмабілізуе іх. Вось прыклад: на 2 сакавіка ў зводцы Загатільну было паказана, што Кублічскі сельсавет выканаў плян на 102,5 проц., а на справе гэты сельсавет зьяўляецца адным з адстаючых і выканаў плян толькі на 70,3 проц.

М.

Аб рабоце Сіроцінскай партарганізацыі па правядзеньні пасеву, уборкі і загатовак ільну

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

1. ЦК лічыць устаноўленым па Сіроцінскім раёне наступнае:

а) што партыйныя, савецкія арганізацыі раёну далі ў часе веснавой сяўбы заведама ілжывыя весткі аб колькасьці засеянага ільну (сельсаветы: Абольскі, Пагарэліцкі, Заранаўскі, Старынаўскі, Жарабіцкі і інш., фактычна засеялі 60-70 проц. пляну), ашукаўшы такім чынам партыю і ўрад;

б) шырока практыкавалі складаньне фіктыўных актаў аб масавай загібелі ўраджаю ў калгасах і выдачу па іх без праверкі страхавой узнагароды ў суме каля 15.000 руб. (Пагарэліцкі, Амбросаўскі, Шуміліцкі, Сіроцінскі і інш. сельсаветы);

в) дапусьцілі загібель і псаваньне ўраджаю шляхам пакіданьня ільну нявыбраным на полі (Пагарэліцкі сельсавет і інш.), знішчэньне ільнатрасты, выкарыстаньне на подсьціл для жывёлы і ўтойваньне капцоў бульбы (калгасы «Бязбожнік», «Чырвоны мак», «Праца», Пагарэліцкага сельсавету, імя Сталіна, Вішнеўскага сельсавету, «Серп і молат», Спаскага сельсавету);

г) дрэнна арганізавалі і кіравалі апрацоўкай ільнатрасты, у выніку чаго засталіся неразасланымі каля 200 тон ільнасаломы і значная колькасьць пашла ў ільнасырэц і паклю;

д) зусім слаба арганізавалі справу ільназагатовак, слаба і несвоечасова праводзілі націск на кулацка-заможныя элемэнты і дапусьцілі засьмечанасьць раду калгасаў клясава-варожымі і антысавецкімі элемэнтамі, у выніку чаго Сіроцінскі раён сарваў выкананьне пляну ільназагатовак (плян ільназагатовак выканан на 5 сакавіка 1933 г. на 63 проц.);

е) слаба праводзяць падрыхтоўку да веснавой пасяўной кампаніі, зусім не забясьпечваюць выкананьня пляну веснавой сяўбы 1933 г. (насеньне ссыпана на 5-III: збожжавае — 78,6 проц., лён—34 проц., бульба—52 проц.).

2. Адказнасьць за ўсё гэта нясуць наступныя асобы:

а) былы сакратар Сіроцінскага РК КП(б)Б т. Самсоненка (зараз на вучобе);

б) цяперашні старшыня РВК тав. Ражноўскі;

в) былы загадчык райза тав. Паўлоўскі;

г) цяперашні сакратар РК КП(б)Б тав. Усенка;

д) цяперашні дырэктар МТС тав. Малашонак;

е) цяперашні загадчык райфа тав. Яшкін;

ж) цяперашні старшыня райКК тав. Цёмкін;

з) былы загадчык райканторы Загатлёна Загацкі;

і) сакратары парт'ячэек і старшыні Заранаўскага, Абольскага, Старынаўскага, Пагарэліцкага і Жарабіцкага сельсаветаў.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Выключыць з партыі і адклікаць з вучобы былога сакратара РК КП(б)Б тав. Самсоненка.

2. Зьняць з работы і выключыць з партыі старшыню Сіроцінскага РВК тав. Ражноўскага.

3. Выключыць з партыі і зьняць з работы цяперашняга сакратара РК КП(б)Б тав. Усенка.

4. Абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем загадчыку Сіроцінскага райфа тав. Яшкіну і зьняць яго з работы.

5. Абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем дырэктару Сіроцінскай МТС тав. Малашонку.

6. Зьняць з работы і абвясьціць вымову старшыні Сіроцінскай РКК тав. Цёмкіну. Пытаньне аб яго партыйнасьці перадаць на разгляд ЦКК.

7. Прасіць ЦКК тэрмінова скончыць справы аб выключэньні з партыі былога загадчыка райза Паўлоўскага і загадчыка Загатлён Загацкага.

8. Прыняць да ведама паведамленьне аб тым, што Загацкі асуджан судом на 10 год, а былы загадчык райза Паўлоўскі прыцягнут да судовай адказнасьці і яго справа будзе разгледжана ў бліжэйшыя дні. Прыняць да ведама паведамленьне аб тым, што старшыні Абольскага сельсавету Касьцюкоў і Шумілаў аддадзены пад суд, старшыня Пагарэліцкага сельсавету Рудзіна і сакратар парт'ячэйкі гэтага-ж сельсавету Котаў выключаны з партыі. Старшыня Заранаўскага сельсавету і сакратар парт'ячэйкі гэтага сельсавету выключаны з партыі. Старшыня Старынаўскага сельсавету Саўчанка аддадзены пад суд, сакратар парт'ячэйкі гэтага сельсавету Градоўскі выключан з партыі. Старшыня Жарабіцкага сельсавету выключан з партыі, сакратар парт'ячэйкі гэтага сельсавету Лядкоўскі асуджан і выключан з партыі.

9. Указаць Наркамзему на недапушчальную практыку прэміяваньня раёнаў без выстарчальнай праверкі і кантролю выкананьня імі плянаў сяўбы.

10. Прапанаваць Наркамзему прыцягнуць да адказнасьці асоб, непасрэдна вінаватых у прэміяваньні Сіроцінскага раёну за сяўбу ільну ў 1932 г.

ЧОРНАЯ ДОШКА

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесены на чорную дошку наступныя раёны:

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ

СЕНЬНЕНСКІ (сакратар РК тав. Дашукевіч, старшыня РВК тав. Себісевіч).

СІРОЦІНСКІ *).

За зрыў загатовак усіх відаў занесены на чорную дошку наступныя сельсаветы:

па Бягомльскім раёне: Дамбражыцкі сельсавет; па Чашніцкім раёне: Стражэвіцкі; па Клічаўскім: Віркаўскі; па Сураскім: Камароўскі; па Аршанскім: Буеўскі; па Пухавіцкім: Гарэліцкі, Шацкі; па Бушацкім раёне: Ісайскі; па Мсьціслаўскім раёне: Татарщанскі сельсавет.

*) Сакратар РК КП(б)Б Усенка і старшыня РВК Ражноўскі пастановай ЦК КП(б)Б зьняты з работы і выключаны з партыі.

Аб скажэньні нацыянальнай палітыкі партыі ў плянава-эканамічным інстытуце

Пастанова бюро Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б

Заслухаўшы інфармацыю тав. Пячона і тлумачэньні дырэктара інстытуту тав. Гурло і сакратара партколектыву тав. Эфрона, бюро ГК лічыць, што тав. Гурло допусьціў грубае парушэньне і скажэньне ленінскай нацыянальнай палітыкі, калі ён, выдаўшы загад ад 26/XI-32 г., у адміністрацыйным парадку пад страхам прыцягненьня да адказнасьці абавязваў «усіх навуковых работнікаў і студэнтаў ужываць беларускую мову як на лекцыях, так і ў штодзенным жыцьці».

Дырэкцыя і партікіраўніцтва гэтым фактычна сталі на шлях забароны карыстаньня расійскай мовай у штодзенным жыцьці, чым допусьцілі грубае і недапушчальнае скажэньне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі, не вялі бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму ў правядзеньні нацыянальнай палітыкі, што ва ўмовах рашаючых перамог нацыянальнай пралетарскай культуры ў БССР зьяўляецца простым патураньнем буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям, выгодным толькі нашым клясавым ворагам.

Бюро ГК адзначае, што тав. Гурло, ня гледзячы на простае і правільнае ўказаньне з боку кіраўніцтва падрыхтоўкі кадраў Дзяржпляну СССР аб палітычнай памылковасьці выданага загаду, не скасаваў яго, як шкодны і палітычны няправільны і да сёньняшняга дня.

Бюро ГК катэгарычна асуджае гэту грубую палітычную памылку, дапушчаную тав. Гурло і бюро партыйнага калектыву ў правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі.

Прымаючы да ведама заяву т. Гурло аб прызнаньні ім сваёй памылкі, абмежавацца вынясеньнем тав. Гурло суровай вымовы за грубае скажэньне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі партыі, за адміністраваньне ў пытаньні беларусізацыі інстытуту і фактычную забарону загадам карыстацца расійскай мовай у штодзенным жыцьці.

ПАСТАВІЦЬ НА ВІД УСЯМУ СКЛАДУ БЮРО КАЛЕКТЫВУ за праяўленьне недапушчальнай палітычнай сьлепаты, якое не заўважыла і зусім не рэагавала на факт простага скажэньня лініі партыі ў нацыянальным пытаньні.

АБВЯСЬЦІЦЬ ВЫМОВУ сакратару партколектыву тав. ЭФРОНУ, які, ведаючы аб загадзе і спрэчках паміж дырэкцыяй і Дзяржпланам СССР вакол гэтага загаду, не надаў ніякага палітычнага значэньня гэтаму пытаньню і не паставіў перад партарганізацыяй аб меўшым месца факце грубага скажэньня нацыянальнай палітыкі партыі.

Вызваліць тав. Эфрона ад работы сакратара партколектыву.

Прапанаваць дырэктару інстытуту тав. Гурло неадкладна скасаваць свой загад, як палітычна-шкодны і парушаючы прынцыпы правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Прапанаваць бюро партколектыву і дырэкцыі інстытуту шырока абгаварыць у партарганізацыі і сярод усёй студэнцкай масы ліст тав. Гікало і Галадзеда, зьмешчаны ў «Праўдзе» ад 4/III-33 г. «Аб памылках партыйных і савецкіх арганізацый Беларусі ў нацыянальным пытаньні» і выправіць у практычнай рабоце інстытуту дапушчаную памылку ў правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі, растлумачыўшы палітычную сутнасьць зробленай дырэкцыяй і партарганізацыяй памылкі і, мабілізаваўшы ўвесь калектыў інстытуту на правільнае і выразнае правядзеньне нацыянальнай палітыкі партыі і яе неадлучнай часткі—беларусізацыі, на сапраўдную барацьбу супроць скажэньняў палітыкі партыі ў нацыянальным пытаньні, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць беларускага, яўрэйскага і іншых колераў шавінізму.

Партарганізацыя інстытуту абавязана ў сваёй рабоце па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі прыняць рашучыя меры, каб нашчэнт зьнішчыць кулацка-буржуазныя і нацыяналістычныя тэндэнцыі і забясьпечыць сапраўдную бальшавіцкую барацьбу за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму, памятаючы, што нацыянальная палітыка партыі перш за ўсё накіравана на «збліжэньне пралетараў і паўпралетараў розных нацыянальнасьцяй для сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы» (з праграмы УсеКП(б)).

УСЕСАЮЗНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПА РАСПРАЦОЎЦЫ ПРАБЛЕМЫ „ВЯЛІКАГА ДНЯПРА"—т. ГІКАЛО

Мы, дэлегаты ўсесаюзнай канфэрэнцыі па распрацоўцы комплекснай праблемы «Вялікага Дняпра» вітаем вас і ў вашай асобе Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі.

Канфэрэнцыя сабралася падагуліць вынікі першапачатковых работ і вызначыць канкрэтныя шляхі далейшай распрацоўкі гэтай праблемы ўсесаюзнага значэньня, вырашэньне якой мае бясспрэчна найвялікшае значэньне для магутнага сацыялістычнага будаўніцтва БССР і УССР.

Ад імя 400 навуковых, тэхнічных і плянавых працаўнікоў, якія сабраліся на канфэрэнцыю «Вялікага Дняпра», запэўніваем вас, што пад кіраўніцтвам кампартыі і яе ЦК, на чале з правадыром сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіным, прыкладзем усе нашы веды і сілы для пасьпяховай распрацоўкі праблемы «Вялікага Дняпра», як магутнай воднай звышмагістралі, як аднаго з буйных фактараў скончаньня сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, далейшага ўмацненьня абароназдольнасьці СССР і эканамічнай незалежнасьці яго ад капіталістычнага сьвету.

ПА ДАРУЧЭНЬНІ КАНФЭРЭНЦЫІ.
Прэзыдыум КАЦЮБІНСКІ, ДОМБАЛЬ.

гор. Кіеў

НАПРУЖЫЦЬ УСЕ СІЛЫ—ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ЛЕСАВЫВАЗКІ

Кулацкі сабатаж ня зломлен

Да канца першага кварталу засталіся лічаныя дні. Між тым весткі аб выкананьні пляну лесавывазкі па Слуцкім раёне гавораць аб пагрозе зрыву выкананьня квартальных заданьняў.

На 10 сакавіка квартальны плян па вывазцы будаўнічых матар'ялаў выканан Слуцкім леспрамгасам толькі на 47,3 проц., па вывазцы дроў—на 72,2 проц.

Факты гавораць аб тым, што кіруючыя арганізацыі Случчыны не мабілізавалі мас на бальшавіцкае выкананьне пляну лесазагатовак і вывазкі, што яны ня лічаць лесавывазку важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніяй.

Рад сельсаветаў раёну зрывае вывазку лесу. Так, Сяраскі сельсавет на 1 сакавіка выканаў... 15,6 проц. квартальнага заданьня, Бокшыцкі—23,2 проц., Прошчыцкі—23,3.

Весткі аб выкананьні цьвёрдазаданьнікамі сваіх заданьняў сьведчаць, што кулацкі сабатаж лесазагатовак і лесавывазкі па Слуцкім раёне ня зломлен. Толькі гніла ліберальнымі адносінамі да кулака можна тлумачыць той факт, што цьвёрдазаданьнікі Прошчыцкага сельсавету выканалі 1,8 проц. сваіх цьвёрдых заданьняў, цьвёрдазаданьнікі Сарагоўскага сельсавету выканалі сваё заданьне на 3,2 проц., Урэцкага—2,3 проц., Грэскага—12,8 проц.

Дрэнна працуюць на лесавывазцы і аднаасобнікі раду сельсаветаў. Так, аднаасобнікі Сарагоўскага сельсавету выканалі сваё квартальнае заданьне па лесавывазцы на 29 проц., Палікарпаўскага—23,5 проц., Грэскага—24,7 проц. Такое-ж становішча і ў радзе іншых сельсаветаў.

Бездарожжа не за гарамі. Слуцкі леспрамгас, партыйныя ячэйкі і сельсаветы павінны неадкладна разгарнуць работу па ліквідацыі адставаньня ў выкананьні пляну лесавывазкі.

Ш.

Рэчыцкі леспрамгас не ліквідаваў адставаньня

На 10 сакавіка Рэчыцкі леспрамгас выканаў сваё заданьне па вывазцы будаўнічага матар'ялу на 58,2 проц. і па вывазцы дроў на 67,2 проц. У апошнія дні тэмпы загатовак і асабліва вывазкі ня толькі не ўзьняліся, але рэзка зьнізіліся. Асабліва адстае калгасны сэктар. Замест 2.183 фурманак, з калгасаў штодзенна выяжджае толькі 550—770.

Значна адбіваецца на выкананьні пляну вывазкі ніская прадукцыйнасьць працы. У сярэднім па раёне вывозіцца ў дзень ня больш 1 кубамэтра. Бабіцкі і камсамольскі вучасткі, якія знаходзяцца блізка ад лясной дачы, выяжджаюць у лес замест 2-3 разоў у дзень,—адзін раз.

Ня гледзячы на тое, што Артукоўскі, Нова-Барсуцкі і Падалескі сельсаветы за зрыў загатовак і вывазкі лесу занесены райкомам КП(б)Б і РВК на чорную дошку, яны не мабілізаваліся на выкананьне пляну лесавывазкі. З Артукоўскага сельсавету замест 550 фурманак 4 сакавіка ў лес выехала 61. З 28 цьвёрдазаданьнікаў у гэты дзень у лесе ня было ні аднаго. Нова-Барсуцкі сельсавет з 200 фурманак высылае 12. Ня лепш працуюць на лесавывазцы і Холмецкі, Вышамірскі, Маладускі, Перасьвятаўскі, Сьвірыдавіцкі і рад іншых сельсаветаў.

Дырэктыва ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб тым, што падрыхтоўка да веснавой сяўбы ні ў якім разе не павінна адбіцца на выкананьні заданьняў па лесазагатоўках і вывазцы, большасьцю сельсаветаў і калгасаў ігнаруецца. Некаторыя калгасы ставяць на адпачынак здаровыя коні і спыняюць лесавывазку.

Часу засталося вельмі мала. Трэба, каб раённыя арганізацыі рашуча ўдарылі па дэмабілізацыйных настроях асобных старшынь сельсаветаў, павялі жорсткую барацьбу з кулацкім сабатажам. Дні, якія яшчэ засталіся, павінны быць ператвораны ў штурмавыя. Пасьпяховае выкананьне пляну лесазагатовак і лесавывазкі павінна быць забясьпечана.

П.

Чорная дошка

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР, за ганебнае адставаньне ў лесазагатоўках і лесавывазцы, заносяцца на чорную дошку наступныя раёны:

ГЛУСКІ (старшыня РВК Зялёнка, дырэктар леспрамгасу Аўксенцеў, упаўнаважаны Левін);

ДУБРОВЕНСКІ (старшыня РВК Сямашка, дырэктар леспрамгасу Калячка, упаўнаважаны Гурвіч);

СЛУЦКІ (старшыня РВК Князеў, дырэктар леспрамгасу Аграновіч, упаўнаважаны Пахомня);

СУРАСКІ (старшыня РВК Казак, дырэктар леспрамгасу Сямёнаў, упаўнаважаны Жукаў);

ТАЛАЧЫНСКІ (нам. старшыні РВК Касьцюковіч, дырэктар леспрамгасу Васілеўскі, упаўнаважаны Жытомірскі);

КЛІМАВІЦКІ (старшыня РВК Буякоў, дырэктар леспрамгасу Шаршнёў, упаўнаважаны Казакоў).

Шматтыражка Віцебскай МТС павінна жыць

(Ліст у рэдакцыю „Зьвязды")

У красавіку мінулага году па ініцыятыве рэдакцыі «Віцебскага пралетара» была арганізавана шматтыражка Віцебскай МТС — «Сацыялістычны шлях». Гэта ініцыятыва была ўхвалена і падтрымана гаркомам партыі і культпропам ЦК КП(б)Б.

Рэдакцыяй нашай газэты была аказана шматтыражцы дапамога і яна пачала выходзіць.

Але не зразумелі ролі шматтыражкі былыя кіраўнікі Белтрактарацэнтру т. т. Качук і Тамашэўскі. Яны выказвалі сваё задаваленьне фактам выхаду газэты, пахвальвалі яе, асабліва пасьля таго, як іх пахвалілі за выпуск адной з нямногіх друкаваных газэт МТС у Трактарацэнтры БССР, але газэце ад гэтага ня было ні горача, ні холадна. Асноўнага, што патрабавала газэта ад гаспадарчага кіраўніцтва, — цьвёрдай матар'яльнай базы забясьпечана ня было. І ў Віцебску, і ў Менску работнікі шматтыражкі і «Віцебскага пралетара» ня раз ставілі аб гэтым пытаньне, але іх абнадзейвалі і... нічога не рабілі.

Нарэшце, накапіўшы звыш 3 тыс. рублёў доўгу, шматтыражка спыніла сваё існаваньне. Кіраўнікі МТС і Трактарацэнтру сустрэлі гэта вельмі холадна.

Сакратар гаркому КП(б)Б тав. Міцькоў два разы тэлеграфаваў тав. Тамашэўскаму ў Трактарацэнтр, патрабуючы стварэньня ўмоў для выхаду шматтыражкі. Адтуль паведамлялі, што грошы на пакрыцьцё запазычанасьці ўжо пераведзены, але іх няма і па сёньняшні дзень.

Далей цягнуць так нельга. Пастанова студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) з усёй выразнасьцю адзначыла палітычную і арганізацыйную ролю МТС у калгасным будаўніцтве і барацьбе з рэшткамі ліквідуемага кулацтва. Друкаваная газэта ў МТС павінна зьявіцца моцным і надзейным органам палітаддзелу МТС у выкананьні ім адказьнейшых задач, вызначаных пленумам ЦК і ЦКК.

Рэдакцыя газэты «ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ».

8 месяцаў цеганіны

(Ліст тэхніка)

У маі 1932 году па ілжывай заяве на мяне аб тым, што я нібыта маю 50 пудоў мукі, якія прысвоіў, скарыстоўваючы сваё службовае становішча, у мяне быў зроблен вобыск. Знойдзена толькі 10 пудоў мукі, якія я купіў. Аднак, мука была чамусьці забрана.

Расьследваньнем было ўстаноўлена, што заява ілжывая, што мука ў колькасьці 10 пудоў была мною куплена для ўласных патрэб. Але пакуль вялося расьследваньне, Ухвальскі сельсавет, Крупскага раёну, муку разбазарыў. Старшыня і сакратар сельсавету, старшыня сельспажывтаварыства і іншыя ўзялі яе сабе на пайкі, ня маючы на гэта ніякага дазволу ні ад міліцыі, ні ад пракуратуры.

Па скончаньні сьледзтва я зьвярнуўся да Крупскага пракурора аб звароце ўзятай у мяне мукі. Пракурор адказаў, што ім дано аб гэтым распараджэньне Ухвальскаму сельсавету, але апошні ня выканаў распараджэньня пракурора. Пасьля гэтага і пачалася цеганіна.

Да гэтага часу я напісаў ужо 35 заяў розным арганізацыям. Ад многіх з іх атрымліваў фармальныя адказы і бюракратычныя адпіскі. Я пісаў тры разы ў газэту «Рабочий», тры разы ў «Зьвязду», тры разы ў «Праўду», ЦКК-РСІ, райпракурору ў Крупкі. Рэдакцыі газэт мне паведамлялі, што мая скарга накіравана або ў Крупскую РСІ, або пракурору на расьсьледваньне. І так справа цягнецца ўжо 8 месяцаў. Акрамя таго, я пісаў у РКК-РСІ, райгазэту «Камуністычны шлях», аднак мне нават не патурбаваліся даць адказу.

Зараз я ня ведаю, што мне рабіць. Прашу «Зьвязду» і ЦВК дапамагчы мне.

Дардыка М. І.

АД РЭДАКЦЫІ: Чакаем ад Крупскага райКК-РСІ хуткага рэагаваньня па сутнасьці гэтага ліста.

З лістоў рабочых і калгасьнікаў

Калгасьнікі калгасу «Камунар», Старчыцкага сельсавету, Чырвона-Слабодзкага раёну, пішуць, што праўленьне калгасу засьмечана клясава-варожымі элемэнтамі. Старшыня калгасу Барадзька Сідар сьпеўся з кулакамі і даваў ім калгасных коняй для апрацоўкі зямлі. А ў той-жа час беднякам Гарбацэвічу П., Зімінскай Н., Главацкай М. і інш. ён адмаўляў у дапамозе нават апрацаваць гароды.

Апрача таго, выдаваліся авансы збожжам кулакам—Гаражанка Янку, Махавенка Антону, Канапляніку П, Кралі і разбазаралі калгаснае збожжа і інш. маемасьць. Аб усіх гэтых агідных з'явах ведалі старшыня сельсавету, ён-жа сакратар парт'ячэйкі,—Саханчук і райземаддзел, але не зварачалі ніякай увагі. У калгасе поўны заціск самакрытыкі. Лепшы калгасьнік Альфяровіч Антон быў выключан з калгасу за тое, што выступаў на сходзе і выкрываў ворагаў у калгасе. А таго, што ў праўленьні знаходзяцца шкоднікі Чыгір Павел і Гарбацэвіч Якуб—ні парт'ячэйка, ні сельсавет ня бачаць.

Шэсьць подпісаў калгасьнікаў.

**

У БРАГІНСКІМ РАЁНЕ яшчэ ў 1921 г. арганізаваўся інтэрнацыянальны калгас «НОВЫ СЬВЕТ». Калгасьнікі ўвесь час умацоўвалі сваю гаспадарку, і працавалі дружна. Але ў апошні час з боку безгаспадарніка САМСОНАВА, выключанага з партыі, Д. ФУРСА і былога контр-рэвалюцыянэра НІКІЦІНА выявілася сыстэматычнае цкаваньне сумленнага старога калгасьніка, яўрэя ШАЙКЕВІЧА Б.

Фурс у часе працы заявіў Шайкевічу: «МАЛА ВАС, ЖЫДОЎ, БІЛІ, ХУТКА НА ВАС УСІХ ПРЫДЗЕ ПАГІБЕЛЬ».

Гэта контр-рэвалюцыйная хаўра зайсецца ўсякімі паклёпніцкімі выдумкамі супроць Шайкевіча за тое, што дзеці яго—партыйцы і камсамольцы—актыўна змагаюцца з чужымі элемэнтамі.

Мясцовыя органы допускаюць блізарукасьць, яны не праявілі належнай чуйнасьці і аб'ектыўна сталі на шлях выжываньня Шайкевіча з калгасу.

УДАРНІК.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя чакае ад Брагінскай райКК-РСІ хуткага расьсьледваньня гэтай справы і прыняцьця адпаведных мер, паведаміўшы пра вынікі.

**

У Рагачове арганізаваны ўсебеларускія курсы калгасводаў, але да курсаў няма належнай увагі ні з боку Калгасцэнтру, ні Наркамзему.

Загадчыкам курсаў быў назначаны п'яніца Лук'яненка, які праваліў справу. Студэнты дабіліся, што Лук'яненка быў зьнят з работы. Рагачоўскі райза назначыў новага загадчыка Цыкунава. Аднак і пры новым загадчыку справа не наладзілася. Курсы выкладчыкамі не забясьпечаны, бываюць частыя зрывы заняткаў і г. д. Студэнты не атрымліваюць своечасова стыпэндыі. Прадстаўнікі НКЗВ абяцаюць палепшыць становішча курсаў, але гэтыя абяцанкі не ажыцьцяўляюцца.

Просім рэдакцыю дапамагчы курсам у справе падрыхтоўкі здольных бальшавіцкіх спэцыялістаў.

Красноў.

**

З боку заводакіраўніцтва заводу «Ударнік» назіраюцца шкодніцкія адносіны да паўфабрыкатаў — драўляных станаў для вагаў. Яшчэ з 1931 г. на пляцоўцы заводу пад адкрытым небам ляжыць больш 200 станаў, якія ад марозу і дажджу патрэскаліся і парассыхаліся.

Відавочна, пускаць гэтыя станы зараз немагчыма, бо якасьць вагаў будзе дрэнная. Адміністрацыя ня хоча навет выйсьці з габінэту і паглядзець, што робіцца вакол.

Капочка.

По сьлядох надрукаваных лістоў

Заметка брыгады ударнікаў друку «Гульня з цацкамі», надрукаваная ў № 2 «Зьвязды» за 1933 г., цалкам пацьвердзілася. Як паведамляе начальнік аддзелу эксплёатацыі МББ чыг., уся гэта справа накіравана Вярхоўнаму пракурору БССР для прыцягненьня вінаватых да крымінальнай адказнасьці.

**

Заметка «Менская МТС не клапоціцца аб кадрах», надрукаваная ў № 19 «Зьвязды», як паведамляе намесьнік начальніка Белтрактарацэнтру—пацьвердзілася. Намесьнік дырэктара МТС Сідараў зьнят з работы і выключан з партыі. Старшаму механіку абвешчана вымова. Апрача гэтага, прынята рад канкрэтных мер па забесьпячэньні МТС рабочай сілай.

Допіс «Героі апартуністычнай практыкі» («Зьвязда» № 45) пацьвердзіўся. Пастановай пасеўпяцёркі Шклоўскага раёну загадчыку МТМ Харыну і дырэктару МТС Зелянкоўскаму абвешчаны вымовы, зьнят з работы старшыня рабочкому МТС Бульдаў і прыняты рад канкрэтных мер у справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

**

Зьмешчаная заметка «Яны за кулакамі» («Зьвязда» № 23) аб тым, што кіраўнікі Маркулаўскага сельсавету і парт'ячэйкі зрасьліся з кулакамі, як паведамляе Рагачоўскі РК КП(б)Б, цалкам пацьвердзілася. Сакратар Маркулаўскай ячэйкі Макаёнак выключан з партыі і справа аб ім перадана судовым органам. Старшыні сельсавету Багдановічу абвешчана суровая вымова.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

РАЗГУЛ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ у ГЕРМАНІІ

Аблавы на рэвалюцыйных рабочых

ЛЕНДАН, 14. Бэрлінскі карэспандэнт «Таймс» паведамляе, што цыркулююць чуткі аб масавых арыштах у часе аблавы на марксыстаў і пацыфістаў на працягу апошняга тыдню. Лік арыштаваных невядомы, але павінен скласьці многія тысячы. Сярод іх — людзі з сусьветнымі імёнамі. Некаторыя былі арыштаваны прыватнымі асобамі. Цыркулююць трывожныя паведамленьні аб Цытадэлі ў Шпандуа, дзе, як кажуць, кінута ў турмы шмат арыштаваных. Карэспандэнт паведамляе, што ў Талкемітку (Усходняя Прусія) расстраляны нібыта два камуністы «пры спробе ўцячы». У Швэйнфурце нацыянал-сацыяліст застрэліў свайго брата за яго «левыя палітычныя погляды».

Карэспандэнт паведамляе аб новых зьбіваньнях амэрыканскіх грамадзян яўрэйскага паходжаньня. На карэспандэнта «Скрыбнэрс Мэгезін» Дальбэрга на вуліцы напаў нацыянал-сацыяліст і нанёс яму некалькі ўдараў. Дальбэрг крыкнуў, што ён амэрыканец, пасьля чаго ўмяшаўся паліцэйскі. Нацыянал-сацыяліст працягваў зьбіваць амэрыканца на вачох у паліцэйскага. Наступнай раніцай да Дальбэрга зьявіўся паліцэйскі афіцэр, які папрасіў яго захаваць у таямніцы ўвесь інцыдэнт. Пасьля нарады з амэрыканскімі афіцыяльнымі прадстаўнікамі Дальбэрг адхіліў просьбу паліцыі.

Дзікія зьдзекі фашысцкіх бандытаў

ВЕНА, 14. Па паведамленьні «Арбайтэр Цэйтунг», 9 сакавіка бэрлінская паліцыя вывела з падвалаў казармаў штурмавых атрадаў на Фрыдрыхштрасе 150 арыштаваных. Большасьць з іх у рэзультаце катаваньняў прышлося зараз-жа зьмясьціць у больніцу. «Колькасьць забітых рабочых нельга нават выявіць прыблізна», — піша газэта. Газэта прыводзіць падрабязнасьці арышту сацыял-дэмакратычнага дэпутата **Зольмана ў Саарблруксне.** Некалькі штурмавікоў уварваліся ў кватэру дэпутата і зьбілі яго да паўсьмерці. Калі вылітыя некалькі вёдраў вады не маглі прывесьці Зольмана ў пачуцьцё, штурмавікі сарвалі з яго бацінкі і панчохі і пачалі падсмальваць яго пяткі гарачымі факеламі, замазалі вочы гарчыцай і мачыліся ў яго рот. У заключэньне Зольман быў праваложаны в музыкай па вуліцах гораду і кінут у падвал.

**

ЛЕНДАН, 14. Бэрлінскі карэспандэнт «Рэфтар» паведамляе, што ў **Анагергу** (Саксонія) **арыштавана 120 камуністаў. У Кенігсбэргу** нацыянал-сацыялісты захапілі дом прафсаюзаў і паранілі 7 сацыял-дэмакратычных рабочых, якія прабавалі аказаць супраціўленьне. Бэрлінскі карэспандэнт «Манчэстэр Гардыян» паведамляе аб захопе паліцыяй прафсаюзных памяшканьняў **у Гамбургу і Кіле.**

Па паведамленьні таго-ж карэспандэнта, на працягу апошніх двух дзён у Баварыі арыштавана 900 камуністаў. Арыштован Гесэнскі прэм'ер сацыял-дэмакрат **Адэлунг. У Бруншвэйгу** арыштаваны былы міністар унутраных спраў Бомс. У **Боне** нацыянал-сацыялісты зьнялі з працы бургомістра і арыштавалі яго намесьніка. Паводле вестак агенцтва «Эсцэнж», у **Людвігсгафене** арыштаваны дзьве камуністкі, члены муніцыпалітэту. Арыштован і адпраўлен у турму бургомістр **Нэйштату.**

Яўрэйскія пагромы ня спыняюцца

ПАРЫЖ, 15. «Ом Лібр» паведамляе, што прасьледваньні яўрэйскага насельніцтва гітлераўцамі працягваюцца. У **Лейпцыгу і Мангейме** турмы настолькі перапоўнены, што частка арыштаваных разьмешчана ў памяшканьнях манежаў і бойняў. Штодзенна ва Францыю прыбывае больш 400 яўрэяў, якія ратуюцца ад пагромаў. Аналёгічны малюнак наглядаецца на дацкай і чэха-славацкай граніцах.

Закрыцьцё вышэйшых навучальных устаноў

БЭРЛІН, 14. У **Франкфурце-на-Майне** пасьля вобыску закрыт вядомы ва ўсім сьвеце інстытут па вывучэньні сацыяльных пытаньняў.

Фізычныя пакараньні ў школах

БЭРЛІН, 15. Міністар асьветы Саксоніі апублікаваў дэкрэт, якім скасоўваецца існаваўшая дагэтуль забарона ўжываць цялесныя пакараньні ў школах.

Камдэпутаты не атрымаюць пэнсіі

БЭРЛІН, 14. Па распараджэньні прэзыдэнта прускага ляндтагу нацыянал-сацыяліста **Кэрля**, нававыбраным камуністычным дэпутатам ляндтагу ня будуць выплачвацца аклады, якія належаць дэпутатам ляндтагу.

ФРАНЦУСКАЯ ГАЗЭТА АБ ПАДПАЛЕ РЭЙХСТАГУ

ПАРЫЖ, 13. «**Дэрньер Нувэль**», якая выходзіць у Страсбургу, паведамляе з праўдзівай, па словах газэты, крыніцы Бэрліну аб пажары рэйхстагу наступнае:

«У дзень, калі рэйхстаг быў падпален, служачыя рэйхстагу былі адпраўлены дамоў у 13 гадзін, бо ім больш ня было чаго рабіць. Гэта распараджэньне пярэчыла службовым правілам. Каб сушаюціць сваё сумненьне, служачыя паведамілі пасьля аб гэтым распараджэньні адміністрацыйнага дырэктара Гале.

У часе работ па ліквідацыі пажару, пажарнікі заявілі члену муніцыпальнага савету **Арэнсу** (дырэктару супроцьпажарнай аховы Бэрліну, члену сацыял-дэмакратычнай партыі), што пажар мог пачацца толькі ў падземным калідоры, які злучае службовую кватэру **Герынга** з будынкам рэйхстагу. **Арэнс,** як і яго сын, былі неадкладна арыштаваны. Ордэры па арышт падпальшчыкаў рэйхстагу былі надрукаваны на пішучай машынцы яшчэ да 27 лютага. Гэта дата была ўстаноўлена ўжо пазьней ад рукі. У першых дакладах, у якіх закранаецца пытаньне аб пажары, гаварылася, што допыт Ван-дэр-Любэ ня мог адбыцца з прычыны таго, што ён ня ведаў нямецкай мовы і адначасова з гэтым паведамлялася, што Ван-дэр-Любэ знаходзіўся ў цеснай сувязі з камуністычнай і сацыял-дэмакратычнай германскімі партыямі».

50 годзьдзе з дня сьмерці К. Маркса

Урачысты сход у Вялікім тэатры

Вялікі тэатр. У глыбіні сцэны гіганцкі партрэт Маркса. Партрэт так па-майстэрску асьветлен, што здаецца нібы жывуць гэта вялікая сівая галава, гэта шырокае абліччa, гэтыя быстрыя, добрыя, ледзь прыплюшчаныя вочы... Вочы глядзяць у залю. Паабапал напаўкруглай залі Вялікага тэатру лёзунгі на галоўнейшых мовах сьвету, лёзунгі пралетарскага інтэрнацыяналізму. Паабапал залі яркачырвоныя істужкі нагадваюць земныя паўкулі, агорнутыя вогненым полымям... А над паўкуляй, над сьветам агорнуты агнём заклік Маркса «**Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!**».

Вялікі тэатр напоўнен маскоўскімі бальшавікамі — рабочымі, вузаўцамі.

Каля 7 гадзін увечары на трыбуне зьяўляюцца спатканыя бурнай авацыяй т. т. **Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Куйбышаў, Андрэеў, Мікаян, Якаўлеў, Сулімаў, Бубноў, Мануільскі, Стэцкі, Рындзін, Камінскі, Хрушчоў і Адарацкі.**

Пры зьяўленьні тав. **Сталіна** ўсе ўстаюць і наладжваюць бурную авацыю прадаўжальніку справы **Маркса і Леніна.**

Сход **ЦК, ЦКК УсеКП(б), ЦВК і СНК СССР, Выканкому Камінтэрну і МК УсеКП(б)** адкрывае тав. **Л. М. Кагановіч.** Уступная прамова тав. **Кагановіча** ня раз перарываецца гарачымі працяжнымі апладысмэнтамі. Слова для дакладу аб Марксе і яго вучэньні даецца тав. **Д. З. Мануільскаму**, спатканаму апладысмэнтамі.

Дакладчык з вычарпальнай паўнатой ахарактарызаваў Маркса, як найвялікшага тэарэтыка і асновапалажніка навуковага камунізму, настаўніка і правадыра міжнароднага пралетарыяту.

Па сканчэньні дакладу т. Мануільскага слова прадастаўляецца для паведамленьня дырэктару Інстытуту Маркса—Энгельса—Леніна т. Адарацкаму, сустрэтаму апладысмэнтамі.

— Ленін у свой час паставіў перад партыяй задачу сабраць і апублікаваць літаратурную спадчыну Маркса. Першая частка заданьня Леніна — зьбіраньне літаратурнай спадчыны Маркса — у значнай меры выканана. У Інстытуце ёсьць каля 700 рукапісаў Маркса і Энгельса, больш 1½ тысяч лістоў Маркса і Энгельса аднаго да другога (ужо выданы ў 4-х тамох). Апрача гэтага, ёсьць вялікая колькасьць лістоў Маркса і Энгельса да трэціх асоб (пры апублікаваньні яны зоймуць ня менш 5 тамоў). Ёсьць таксама архіў І Інтэрнацыянала у 781 дакумантам. Сабрана яшчэ ня ўсё. Наперадзе яшчэ вялікая работа.

На працягу апошняга году набыта: рэдакцыйны экзэмпляр «Новай Рэйнскай газэты», з адзнакамі Маркса, 1-ы том «Капіталу» ў фотаздымках (таксама з адзнакамі Маркса). З поўнага збору твораў Маркса ў рускім выданьні выйшлі 16 томаў, 10 выйдуць у гэтым годзе, і астатнія 8 будуць гатовы ў будучым годзе.

Пасьля агалашэньня тав. Стэцкім пастановы СНК СССР з повваду 50-годзьдзя са дня сьмерці Карла Маркса, сход пад бурныя апладысмэнты і гукі «Інтэрнацыяналу» закрываецца.

Церахаўка павінна выйсьці з фінансавых прарываў

Церахаўскі раён зьяўляецца самым адсталым у выкананьні фінансавых пляноў. На 1-е сакавіка 1933 году квартальны плян выканал толькі на 42,9 проц., з якіх па дабраахвотных плацяжох—23 проц. і па культзборы—28,5 проц. Яшчэ горш справа з выкананьнем пляну па падатках—з аграмаджанага сэктару, па якіх плян выканан на 30 проц.

У раёне ёсьць сельсаветы, якія сапраўды па-бальшавіцку змагаюцца за выкананьне фінансавага пляну. **Так, Маркавіцкі** сельсавет выканаў на 1 сакавіка 60 проц. квартальнага пляну. **Краўцоўскі** сельсавет, які на 1 сакавіка выканаў квартальнае заданьне на 75 проц. 6 сакавіка поўнасьцю скончыў выкананьне квартальнага пляну, ліквідаваўшы ўсю запазычанасьць і абавязаўся працягваць работу па распаўсюджаньні пазык і ўцягненьні ўкладаў у ашчадкасы.

Але побач з гэтымі сельсаветамі, асобныя сельсаветы раёну ганебна зрываюць выкананьне фінпляну. Так, **Дуброўскі** сельсавет свой плян выканаў на 20 проц., **Глыбоцкі**—25 проц., **Перарастаўскі**—26 проц., **Церахаўскі**—30 проц.

Справа па ашчадкасах у раёне стаіць надзвычай дрэнна. Калі на 1 студзеня 1932 году колькасьць укладчыкаў у ашчадкасы складала 5.602, дык зараз іх ёсьць 4.486. Вынікі мінулага апэрацыйнага году па ашчадкасах раёну даюць дэфіцыт у суме каля 600 руб. Прыліву ўкладаў у першым квартале бягучага году няма.

Нездавальняюча справа і з пазыкай. Агульны плян па пазыцы выканан на 65 проц. Рад сельсаветаў яшчэ і на сёньня ня скончылі афармленьне даўно праведзенай калектыўнай падпіскі на пазыку. Рад калгасаў і арцеляй яшчэ і дагэтуль не ахоплены пазыкай.

Асноўнымі прычынамі такога становішча зьяўляюцца самацёк і слабая масава-арганізацыйная і растлумачальная работа. Упаўнаважаныя па розных палітычна-гаспадарчых кампаніях справе выкананьня фінпляну не аддаюць належнай увагі. Камісіі садзейнасьці і фінансавыя сэкцыі ня толькі не працуюць, але нават у большасьці арганізацый іх зусім няма. Раённая камісія садзейнасьці фактычна існуе на паперы.

У выніку дрэннага выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў значна затрымліваецца выплата заработнай платы, запазычанасьць па якой, асабліва настаўнікам даходзіць да 2-3 месяцаў. Побач з запазычанасьцю па зарплаце, у выніку адсутнасьці адпаведнага кантролю з боку райфа ёсьць выпадкі перавыдаткаў фондаў зарплаты.

Выяўленьне і абкладаньне кулацкіх гаспадарак не разгорнута. На 1 сакавіка абкладзена па раёну ўсяго толькі 10 кулацкіх гаспадарак.

Нездавальняюча праходзіць мабілізацыя сродак і па сыстэме спажыўкааперацыі. На 1 сакавіка спажыўкааперацыя выканала свой плян толькі на 55,5 проц., з якіх па паявых узносах—44 проц. У пасобных сельспажыўтаварыствах вынікі яшчэ горшыя. Залежы тавараў перавышаюць устаноўленыя нормы; яны на сакавік па раёну складаюць 25-30 дзён, а ў пасобных сельспажыўтаварыствах нават даходзяць да 40, замест устаноўленых 20. Ёсьць выпадкі прымусовага асартымэнту тавараў, як напрыклад: попельніцы, балеткі і інш., якія складаюць значную залеж.

Спажыўсыстэма не аддае належнай увагі па-за плянаваму тавараабароту, які не дасягае і 50 проц. намечанага пляну. Адкормачныя пункты амаль не існуюць, а калі пры якім небудзь сельспажыўтаварыстве і арганізаваны, дык з вельмі абмежаванай колькасьцю жывёлы. Райсаюз у свой час арганізаваў прыгарадную гаспадарку, якая каштавала 80.000 руб., але гаспадарыць ня здолеў і быў вымушан прадаць яе, у выніку чаго панёс страты на суму каля 50.000 руб.

Дрэнна справа і з каапэраваньнем насельніцтва. Па **Дуброўскім** сельсавеце заданьне па каапэраваньні выканана на 17 проц. З 3.000 чал., якія маюць права на каапэраваньне па гэтым сельсавеце ахоплена толькі 674 або 22 проц.

Скарыстаньне вызначаных на першы квартал крэдытаў, у асноўным для падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, па калгасах, саўгасах і МТС вельмі нязначнае. Па калгасах раёну на 1 сакавіка з адпушчаных 12.200 руб. скарыстана толькі 3.618 руб. або 29,5 проц. Па саўгасах з 85.530 руб. скарыстана 30.300 або 35,4 проц. Яшчэ горш па МТС, якія з адпушчаных 29.000 руб. не скарысталі ні аднэй капейкі.

Трэба сказаць, што работа па выкананьні фінансавага пляну ў раёне ня ўвязваецца з палітычна-гаспадарчымі кампаніямі. Магчымасьці для выкананьня пляну раён мае, аб чым сьведчыць работа пасобных сельсаветаў, але вопыт іх работы не пераносіцца на астатнія. Фінансавы апарат раёну яшчэ ня стаў баявым штабам па разгортваньні фінансавай работы.

Фінансавыя органы Церахаўшчыны павінны прыняць рашучыя меры да ажыўленьня арганізацыйна-масавай работы па выкананьні фінансавага пляну. Асабліва рэзкага пералому неабходна дабіцца ў галіне ахопу насельніцтва пазыкаю, паляпшэньня работы ашчадкас і спажыўкааперацыі.

Б. Спарыхін.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Сож стане суднаходным

Ня так даўно ў раёне левага прытоку Дняпра—ракі Сож паміж паселішчамі **Стайкі і Бахарэцку,** былі знойдзены паклады фасфарытнай руды—надзвычай каштоўнага ўгнаеньня. Магутнасьць пакладаў вылічваецца **мільёнамі тон.** Выгадней за ўсё перавозіць руду да сельска-гаспадарчых раёнаў па вадзе, але як вазіць, калі **Сож мелкі, а ў некаторых мясцох зусім не судна ходны.**

На Сожы, на вучастку Крычаў-Стайкі, прыступілі да будаўніцтва плацін і шлюзаў з тым, каб прыстасаваць водныя шляхі для перавозак фасфарытаў.

На будаўніцтва было адпушчана **6.400 тыс. руб.** У першую чаргу **будуюцца толькі 4 плаціны №№ 2, 4, 5 і 6 і чатыры шлюзы.** Узяты вучастак з найменшай глыбінёй.

Ажыцьцяўленьне работ першай чаргі павысіць глыбіню Сожу ў вучастку Крычаў—Стайкі **да 1 мэтра.** Тэрмін сканчэньня чатырох плацін і шлюзаў назначан **1-га студзеня 1934 г.**

Будаўніцтва на Сожы цесна зьвязана з праблемай «Вялікага Дняпра».

Пасьля рэканструкцыі па Сожы пойдуць наступныя грузы: **уніз** галоўным чынам будуць перавозіцца **фасфарыты, цэмэнт і сельска-гаспадарчыя прадукты.** Грузапрапускная здольнасьць у гэтым напрамку—3.500 тыс. тон. **Уверх пойдуць вугаль, мэталь, соль.**

Наркамвод ужо згадзіўся з неабходнасьцю ў бліжэйшы час прыступіць да работ другой чаргі. Другі вучастак патрабуе 8 млн. руб. Пакуль, што распачаты вышуканьні. У 1933 годзе будаўнікі прыступаюць да падрыхтоўчых работ.

Да канца 1933 г. або самае большае ў першым квартале 1934 году, пасьля спаду веснавой вады — усе работы першай чаргі павінны быць скончаны.

Два мільёны рублёў на рамонт дамоў

Плян капітальных работ на жактах на 1933 год зацьверджаны менскім гарсаветам у 2 млн. руб.

Ахова жылфонду прыроўнена да закону аб ахове дзяржаўнай маемасьці, аб чым даны адпаведныя ўказаньні судовым органам.

Адначасова распачата праверка ўсяго складу загадчыкаў дамамі і дворнікаў з мэтай ачысткі ад клясава-чужых элементаў. Распрацоўваецца новы праект палажэньня аб правах і абавязках загадчыкаў дамамі і дворнікаў як па жактаўскіх, так і камунальных домаўладаньнях.

На працягу сакавіка-красавіка будзе праведзен масавы паход па ўкараненьні санмінімуму і праведзеньні дробнага рамонту.

Гарсавет адзначыў, што мінулае і ня першае кіраўніцтва гаржылсаюзу апартуністычна аднеслася да выкананьня дырэктыў партыі аб паляпшэньні работы жактаў. У выніку дэфіцыт па жактах за 1932 год складае суму ў 955 тыс. рублёў. Бязсыстэмнасьць і бясьпляновасьць у рабоце гаржылсаюзу і раду жактаў прывялі да сур'ёзных прарываў у фінансавым і гаспадарчым становішчы жыльлёвай каапэрацыі.

Школам—стабільныя падручнікі

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі падрыхтавала да друку рад стабільных падручнікаў для школ. Сярод іх «Гісторыя фэадалізму» Рубіна, «Фізыка» Брохэса, «Чытанка на расійскай мове»—для шостага году навучаньня, «Руская гісторыя»—Пакроўскага для старшага канцэнтру сямігодак, чытанка на беларускай мове Матлюка для 1-га году навучаньня, два лемантары Пісарчыка і Пігулеўскага для 1-га году навучаньня і інш.

Сваячасова падрыхтавацца да паводкі

Гарсаветам створана цэнтральная і сем раённых троек па барацьбе з веснавой паводкай у Менску.

Ужо праводзіцца рад практычных мерапрыемстваў. Заканчваецца рамонт 62-хлодак, будуецца 10 плытоў.

Створана спэцыяльная камісія па ахове і папярэджаньні затапленьня гарадзкой электрастанцыі. Такія-ж тройкі арганізуюцца на некаторых прадпрыемствах.

Т. т. Турэцкаму і Гантману прапанавана прыняць меры для забесьпячэньня хлебам насельніцтва раёнаў гораду, што затапляюцца.

Будаўніцтва новых гукавых кіно-тэатраў

Галоўнае кіраўніцтва кіно-фотапрамысловасьці пры СНК СССР пастанавіла ў бягучым годзе закончыць будаўніцтва двух новых гукавых кіно-тэатраў у БССР, пераабсталяваць і зрабіць гукавымі 15 існуючых нямых кіно, 8 рабочых клюбаў, 3 сельскія кіно-стацыянаркі. На гэту мэту адпускаецца звыш мільёна рублёў.

1 лістапада ў Воршы павінен быць адкрыт гукавы кіно-тэатр на 800 месц. Побач з гэтым павінны быць разгорнуты работы па будаўніцтве гукавага кіно ў Менску на 1.000 месц. На будаўніцтва менскага тэатру асыгнуецца ў бягучым годзе 600.000 руб.

(БЕЛТА).

НОВАЯ АНТЫСАВЕЦКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ ЦЬВЁРДАЛОБЫХ

ЛЕНДАН, 12. Орган Ротэрміра «Сэндэй Дыспэтч» публікуе грубую фальшыўку, якую газэта называе новым «чырвоным лістом». У гэтай фальшыўцы, якая прадстаўляе сабой надрукаваны на машынцы «дакумант», даецца дырэктыва ангельскім камуністам арганізаваць хваляваньні ў дзень 1 мая і гаворыцца аб адпраўцы для гэтай мэты **1.000 фунт. стэрлінгаў.** Аб характары фальшыўкі даюць прадстаўленьне наступныя вытрымкі: «Пры цяперашняй сітуацыі неабходна выпрацаваць настрой ангельскага пралетарыяту. З гэтай мэтай павінна быць створана строга цэнтралізаваная арганізацыя, якая павінна заняць месца цяперашніх ячэек». «Ячэйкі павінны выкарыстаць усе магчымыя сродкі для таго, каб выклікаць хваляваньні ў арміі, марскім і паветраным флёце». «Мы задаволены тымі мэтадамі, пры дапамозе якіх вы падрываеце прафсаюзы. Вы павінны ўнушыць асобным членам прафсаюзаў, што гэтыя арганізацыі і іх лідэры прадстаўляюць толькі частку капіталістычнай сыстэмы і растлумачыць, што ў іх інтарэсах аддзяліцца ад прафсаюзаў, з тым, каб потым можна было спараджаць аддзяленьне «Прафінтэрну» ў Англіі». «Яшчэ не надышоў час для ўсеагульнай рэвалюцыі ў Англіі, таму мы прадастаўляем вам самім выпрацаваць дэталі правядзеньня для 1-га мая». «Працоўцы і члены ячэек павінны старацца выклікаць нязначныя хваляваньні ў гэты дзень для таго, каб высьветліць, у якой меры можна разьлічваць на падтрыманьне ўсяго насельніцтва. Мы лічым май 1936 году найбольш прыдатнай датай усеагульнага паўстаньня». «Ваша прапагандысцкая работа павінна па-ранейшаму праводзіцца ў сакрэтным парадку». «Копія гэтага дакуманту выслана нашым агентам у Ліверпулі, Дубліні, Н'ю Кэстль. Перадайце копіі ў Манчэстэр, Брыстоль і Кардыф».

«Дакумант» прадстаўляе сабой выключна грубую падробку. Словы «ІККИ», якое ставіць у пачатку ліста, перададзена чамусьці ў германскай транскрыпцыі праз два К, замест два СС. („EKKJ" замест „ECCJ"), дата „1 сакавіка" напісана „1-n März" замест „1-st of march", як трэба было-б па ангельску.

Тое, што слова «Прафінтэрн» узята ў двукосьсі, характэрна для ўсіх фальшывак, якія распаўсюджваліся ў Англіі ў апошнія гады. Характэрна таксама ўжываньне шатляндзкага слова „anfini" (што азначае „каля"), улюбёнага слоўца тутэйшых бульварных журналістаў, якое ніколі ня ўжываецца па-ангельску. «Ліст перасьцерагае камуністаў ад прыёму ў выканаўчы камітэт „reformere", як відаць, замест „reformist" — г. зн. рэфармістаў.

Мэты, якімі кіраваліся аўтары фальшыўкі, публікуючы яе ў цяперашні момант, зразумелы ня цяжка. Сама газэта раскрывае карты, заяўляючы, што «дакумант сьведчыць аб падвойнай ігры Масквы, якая заклікае сацыялістаў, прафсаюзы і каапэрацыйныя арганізацыі да адзінага фронту».

Зьдзекі фашысцкіх катаў над вучнямі беларускай гімназіі

ВАРШАВА, 14. Гэтымі днямі група беларускіх дэпутатаў польскага сойму ўнесла ў сойм запытаньне, у якім падрабязна апісваюцца катаваньні і зьдзекі паліцэйскіх у Навагрудзкім ваяводзтве над вучнямі мясцовай беларускай гімназіі. Аднаго з вучняў **В. Ханько** разьдзелі да гала і білі гумовымі палкамі па пятках і галаве да таго часу пакуль ён не падпісаў патрабаванага прызнаньня аб тым, што ён зьяўляецца нібыта членам камуністычнай ячэйкі. Аналёгічнаму допыту падпадалі таксама і іншыя яго таварышы па гімназіі.

ПОЛЬСКА-ДАНЦЫГСКІ КАНФЛІКТ У ЛІЗЕ НАЦЫЙ

ЖЭНЭВА, 14. Пытаньне аб польска-данцыгскім канфлікце, якое абмяркоўвалася ў савеце Лігі нацый, вырашана заявай польскага міністра замежных спраў Бэка. Пасьля заявы прадстаўніка Данцыгу, які абяцаў прыняць усе меры для забесьпячэньня польскіх правоў на Вэстарплятэ, Бэк заявіў аб рашэньні польскага ўраду неадкладна зьменшыць свой гарнізон на Вэстарплятэ да звычайных разьмераў. Разам з тым, ён прызнаў, што павялічэньне гэтага гарнізону не адпавядала існуючым згодам.

ФАШЫСЦКІ ПЕРАВАРОТ У ГРЭЦЫІ

АФІНЫ. Пасьля выбараў у парлямант, у якім урадавы блёк, што кіруецца Вэнізэлосам, пацярпеў паражэньне, атрымаўшы толькі 111 мандатаў з агульнай колькасьці 248, генэрал Пластырас пасьля адстаўкі ўраду Вэнізэлоса абвясьціў ваенную дыктатуру і стан аблогі па ўсёй краіне. Пластырас скасаваў канстытуцыйныя свабоды і выдаў адначасова загад аб забароне ўсіх сходаў і дэманстрацый і аб увядзеньні цэнзуры.

Пасьля агалашэньня дыктатуры, генэрал Пластырас зьвярнуўся з адозвай да насельніцтва краіны, у якой ён абгрунтоўвае агалашэньне дыктатуры паражэньнем ураду Вэнізэлоса і немагчымасьцю пры існуючай выбарчай сыстэме стварыць моцны ўрад. У сваёй адозьве Пластырас стараецца далей апраўдаць ваенны путч крызісам парлямантарызму і ростам камуністычнага руху і ставіць задачай свайго ўраду «выратаваньне краіны з фіскоў эканамічнага крызісу і пераможаньне камуністычнай небясьпекі».

Дыктатура генэрала Пластыраса пратрымалася менш сутак. Рабочыя ва ўсіх гарадзкіх цэнтрах адказалі на ваенны путч Пластыраса бурнымі дэманстрацыямі. У Афінах дэманстрацыя рабочых была абстраляна кулямётамі войск. Паводле паведамленьняў друку, лідэры абодвух блёкаў—Вэнізэлос і Цальдарыс, баючыся ў сувязі з павышэньнем актыўнасьці мас узброенай барацьбы, запрапанавалі прэзыдэнту ў імя «аднаўленьня законнасьці» перадаць уладу да скліканьня парляманту генэральскаму габінэту, склад якога павінен быць дапоўнен чыноўнікамі.

Генэрал Офініас сфармаваў генэральскі габінэт у наступным складзе: прэм'ер і ваенны міністар—генэрал Офініас, міністар шляхоў зносін, а часова таксама і міністар земляробства—генэрал Манетаа, міністар асьветы—генэрал Мазарыкіс, міністар фінансаў—дырэктар нацыянальнага банку Корыцыс, міністар замежных спраў—генэральны дырэктар міністэрства замежных спраў Майрудыс, міністар юстыцыі—пракурор вярхоўнага суда Гідопулос, міністар народнай гаспадаркі—дырэктар дзяржаўных чыгунак Коруніс, міністар аховы здароўя і сацыяльнага забесьпячэньня—адмірал Панас, міністар па морскіх і авіяцыйных справах—контр-адмірал Дэмэстыху.

АБВАСТРЭНЬНЕ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ Ў АЎСТРЫІ

ВЕНА, 15. Урад Дольфуса апублікаваў 12 новых надзвычайных дэкрэтаў, у тым ліку дэкрэт, які абмяжоўвае права саюзаў і сходаў, забараняючы нават закрытыя сходы саюзаў. Сёньня сацыял-дэмакратычная «Арбайтэр Цэйтунг» канфіскавана. Для камуністычнай «**Ротэ Фанэ**» ўведзена папярэдняя цэнзура. Газэта выйшла сёньня з вялікімі белымі цэнзурнымі плямамі. Усе мерапрыемствы накіраваны супроць камуністычнага руху. Учора войскі занялі пляц і галоўныя вуліцы прамысловага гораду Галейну (правінцыя Зальцбург). Жандармэрыя наладзіла масавыя вобыскі ў рабочых дамох Гайлену і арыштавала шмат рабочых, западозраных у камуністычнай дзейнасьці.

Пратэст амэрыканскага ўраду

ВАШЫНГТОН, 15. Дзяржаўны дэпартамант ЗАЗШ зрабіў запытаньне германскаму ўраду ў сувязі з арыштам бэрлінскага карэспандэнта сацыялісцкай яўрэйскай газэты «Форуард» **Лешчынскага.**

**

Н'Ю-ЁРК, 15. «Нацыянальны камітэт абароны палітвызваленых» (арганізацыя лева-лібэральных пісьменьнікаў, артыстаў і настаўнікаў) зьвярнуўся да міністра замежных спраў Хелу і германскага генэральнага консула з пратэстам супроць зьбіеньня ў Бэрліне амэрыканскага пісьменьніка Гальберга, карэспандэнта вядомай часопісі «Скрыбнерс Мэгэзін», патрабуючы неадкладнага пакараньня вінаватых.

Землятрасеньне ў Паўднёвай Каліфорніі

Н'Ю-ЁРК, 11. Землятрасеньне, якое адбылося ў Паўднёвай Каліфорніі, зьяўляецца найбольш буйным за ўсе землятрасеньні, якія былі ў Злучаных Штатах за апошнія 27 год. Паводле апошніх вестак колькасьць забітых дасягае 140, а параненых — 500. Страты вылічваюцца ў 50 млн. даляраў. На тэрыторыі вакол Лёс-Анжалёс на плошчы ў 200 міл. даўжыні і 30 міл. шырыні ноччу і сёньня раніцой адчуваўся 21 штуршок. Больніцы перапоўнены паранеными.

СЁНЬНЯ, роўна ў 7 гадзін вечара ў памяшканьні Дзяржтэатру *адбудзецца*

аб'яднанае пасяджэньне

пленумаў ГК і ГКК КП(б)Б, Гарсавету, гарпрафсавету і гаркому ЛКСМБ

сумесна з цэнтральнымі, партыйнымі, прафэсыянальнымі і грамадзкімі арганізацыямі і ўдарнікамі прадпрыемстваў гор. Менску,

прысьвечанае 50-годзьдзю з дня сьмерці Карла Маркса.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. **Карл Маркс і сусьветна-гістарычнае значэньне марксызму-ленінізму** (дакладчык тав. **ГОРЫН**).

Члены ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ГК і ГКК КП(б)Б, ЦК і ГК ЛКСМБ, ЦВК, СНК, гарсавету, ЦСПСБ і ГСПС праходзяць па сваіх мандатах.

Запрашальныя білеты для ўдарнікаў разьмяркоўваюцца праз ГСПС.

Паведамленьні

— 18 сакавіка, у 6 гадз. вечара, у памяшканьні Дому Камасьветы адбудзецца нарада прапагандыстаў, што працуюць у партыйных школах (кандыдацкіх, першапачатковых, ВСПШ, марксыцка-ленінскіх гуртоках і гуртках бягучай палітыкі) па пытаньні прапрацоўкі нацпытаньня ў партшколах. У часе нарады будуць працаваць ларкі Агіза, Дзяржвыдавецтва БССР з літаратурай па нацпытаньні. Яўка ўсіх прапагандыстаў абавязкова. Сакратаром партыкалектываў і ячэек забясьпечыць яўку прапагандыстаў, а таксама сакратаром партыкалектываў навучальных устаноў забясьпечыць яўку студэнтаў, працуючых у партшколах.

— 19-III—33 г., у 12 гадз. раніцы, у памяшканьні Дому Камасьветы (рог Энгельса і К. Маркса) Менгаркомам КП(б)Б і рэдакцыямі цэнтральных газэт склікаецца раённы зьлёт рабсялькораў Менскага раёну. Сакратары парткалектываў і ячэек павінны забясьпечыць яўку ня менш 2-3 чалавек ад кожнага калгасу і 3-5 чалавек ад саўгасу і МТС.

Менгарком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ-1)
Маст. кіраўн. ЛІТВІНАЎ. Л. і П. Тур.
СЁНЬНЯ **ЗЯМЛЯ І НЕБА** п'еса ў 4-х дзеях. Пачатак у 8 г.

Памяшк. Яўр. Дзярж. Тэатру (вул. Валадарскага, 7, тэл. 21-813)
СЁНЬНЯ 18 ЛЮТАГА Аднаўленая праграма
МЮЗІК-ХОЛ
выступаюць:
Неклюдава і Мураўскі—лепшыя сатырыкі СССР.
Ноўзен і Дзьмітрыеў—муз. скетч.
3—КАНСІ—3 калесыпэдысты.
Савонаў, Радзенскі і Рыкала—народна-украінскія скокі.
Вал. Валертынскі—сьпевы быту.
2—Сьлефані—2 паветраная рамка.
2—Асвольдо—2 экрабаты.
Быхеўская—арыі з опэры.
Загар і Каблі—снайпэры, новыя трукі.
Стрыгін—віртуоз на баяне.
Струнны аркестр у складзе 17 чал. пад дырыж. КУНІНА.
Пачатак—8 г. 30 м. вечара.
Штодзенна адно выступленьне ў двух вялікіх аддзяленьнях.

Лазьне-пральнае кіраўніцтва г. Менску
паведамляе, што для лепшага абслугоўваньня насельніцтва
ЛАЗЬНІ
адкрыты **кожны дзень** з 8 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы, а продаж білетаў праводзіцца з 8 г. раніцы да 11 з палов. г. ночы.
Дырэктар трэсту МАРГОЛІН.

ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК
АДКРЫТА
ПАПЯРЭДНЯЯ ПАДПІСКА НА
І ТОМ „КАПІТАЛУ" КАРЛА МАРКСА
на беларускай мове
ПЕРШАЕ патанёнае выданьне выйдзе ў 5 выпусках па 3 руб. за выпуск.
І ДРУГОЕ, юбілейнае выданьне багата ілюстраванае, на лепшай паперы, у каленкоравым пераплёце цаною 18 руб. пры падпісцы.
Юбілейнае выданьне часткаю будзе выпушчана патаненым выданьнем для масавага распаўсюджаньня праз арганізацыі.
Грошы і карэспандэнцыі накіроўваць па адрасе: МЕНСК, БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК, ВЫДАВЕЦТВА.

„Чырвоная Зорка" КАСА—ад 1 г. дня	НАЕЗЬНІК з Уайльд-вэста 2 серыя ў адзін сеанс.
1-шы дзіцячы гукавы кіно-тэатр КАСА—з 10 г. ран.	Гукавая праграма 1) БЯГЛЕЦ, 2) Паравоз, наці наперад
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 12 г. дня	Мастацкі фільм ДАЧКА РАФКЭ
Пралетары КАСА—ад 12 г. дня	Новы сав. мастацкі фільм ВОЧЫ АНДОЗІЯ драма ў 7 частках.
„СПАРТАК" КАСА—ад 1 г. дня	Замежны фільм ДОННА ЖУАНА Камэдыя ў 9 частках.

СЭНТАР КАДРАЎ ВОСУ
АРГАНІЗУЕ
ГРУПУ РАХУНКАВОДАЎ
для раёну для сыстэмы
БЕЛКААПРАМСАВЕТУ.
Стыпэндыя ад 40 да 80 руб. у месяц і кватэрных 20 руб. Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.
Заявы з дакумантамі: аб сацстановішчы, аб адукацыі (не ніжэй 6-ці груп), аб узросьце (не менш 17 год), а для калгасьнікаў згоду праўленьня, прымаюцца ў канцылярыі ВОСУ (Менск, Камуністычная, 16, 10-ты (пакой)) **ДА 30 САКАВІКА** ад 12 да 2 гадз. штодзенна. Заявы без пералічаных дакумантаў разглядацца не будуць. Курсанты прымацоўваюцца да сталоўкі.

ТРАНСПАРТНЫ ТРЭСТ МЕНГАРСАВЕТУ
АДКРЫВАЕ
2-МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ вагонаважатых
з 25 сакавіка 1933 году.
Жадаючыя паступіць на курсы падаюць заявы з дакумантамі па адрасе: Пляц Волі № 4, транспартны трэст. Інтэрнатам не забясьпечваюцца. Заявы завочна разглядацца не будуць.
Транспартрэст.

Інстытут Масавага Завочнага Навучаньня Партактыву пры ЦК КП(б)Б.
УВАГА!..
17-га сакавіка, у 7 гадзін вечара.
Радыелекцыя партвучобы:
„Калгасная вытворчая брыгада ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы"
(лектар т. ВАЛЕСКІ).

ВЫДАВЕЦТВУ "ЗЬВЯЗДА"
ПАТРЭБЕН
ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР.
ЗВАРАЧАЦЦА:
Савецкая, 63, 2-гі паверх

МЕНГАРБЮРО САЮЗДРУКУ
даводзіць да ведама ўсіх устаноў, прадпрыемстваў і індывідуальных падпісчыкаў, што
падпіска
на газэты і часопісі на 2-гі квартал 1933 г. (красавік—чэрвень)
будзе прымацца толькі
да 20 сакавіка.
Падпісацца можна таксама і ва ўсіх кіёсках.
ПАСЬПЯШАЙЦЕСЯ ЗДАЦЬ ПАДПІСКУ.
Менгарбюро Саюздруку.

Менск, друкарня газэты «Зьвязда»

Галоўлітбел № 337